Пролетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Органа Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

НОШТ НУМАРУ 5 кап.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Незакарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 80 к. • 3 „ — 2 р. 70 к. • 6 „ — 4 р. — к. • 1 год — 8 р. — к. Зьмена адрасу іншагародняй — 30 к. мясцовая — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок капітэрнай пасьля тэксту — р. 50 к. За радок капітэрнай пасьля тэксту 1 р. — к. За радок капітэрнай перад тэкстам 1 р. 50 к. Сьвяшчэнныя на 50 проц. дарожэй. Зьмена тэксту бярэцца 10 проц. кошту.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумант — 25 кап. За кожны дадатковы — 15 „ Бесспрэчныя і чырвонаармейцы за дакумант — 15 „ За кожны дадатковы — 5 „ Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газеты, на ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пашт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газеты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

10 год выданьня — ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. — № 241 (2730) Нядзеля, 20-га кастрычніка 1929 г.

НАЗНАЧЭНЬНЕ тав. Я. Б. ГАМАРНІКА.

Сакратар ЦК КП(б)Б, член РВС СССР тав. Ян Барысавіч ГАМАРНІК назначаны начальнікам Палітычнага Кіраўніцтва Рабоча-Сялянскай Чырвонай арміі.

Прыводзім загад старшыні Рэвваенсавету СССР т. К. Е. Варашылава.

№ 561

Па асабовым складзе арміі 15 кастрычніка 1929 г. Гор. Масква.

Начальнік Палітычнага Кіраўніцтва РСЧА і член РВС СССР тав. А. С. БУБНОЎ аслабаняецца ад займаемае пасады з 1-га кастрычніка 1929 г., у зьвязку з назначэньнем Народным Камісарам Асьветы РСФСР, згодна пастановы прэзыдыуму ЎсеЦВК ад 12 верасьня 1929 г.

Член Рэвалюцыйнага Ваеннага Савету СССР т. ГАМАРНІК Ян Барысавіч назначаецца начальнікам Палітычнага Кіраўніцтва РСЧА.

Народны Камісар па ваенных і марскіх справах і Старшыня Рэвалюцыйнага Ваеннага Савету Саюзу ССР ВАРАШЫЛАЎ.

НАЧНОЕ РАДЫЁ.

Афганістанскі урад за добрасуседзкія адносіны з СССР

(Радыёграма з Кабулу).

МАСКВА, 19-X. 19-га гэтага кастрычніка Народны Камісарыят Замежных Спраў атрымаў ніжэй паданую радыёграму з Кабулу ад міністэрства замежных спраў.

„Храбрая афганская армія пад камандаваньнем генэрала Шах-Валі-Хана і яго брата генэрала Шах-Мальмуд-Хана адабрала Кабул ад Бачэ-і-Сакао. 10 кастрычніка Арк бамбардыраваўся. 13 кастрычніка Бачэ-і-Сакао з сям'ёй і частка яго прыхільнікаў уцяклі. Частка арміі Бачэ-і-Сакао ўцякла, а частка здалася адважнаму хану. Большасьць міністраў Бачэ-і-Сакао скарылася. Кугістанцы раскайваюцца.

Урад зьлітаваўся над ворагам. Кандагар, Кабул, Паўднёвая правінцыя, Джалалабад, Хэвароджат пад нашай уладай. Нашы прыхільнікі ў Мазарэ, Катагане, Бадахшане, Мэймэне і Гэраце, змучаныя ўладаньнем Бачэ-і-Сакао, чакаюць загаду ад цэнтральнага ўраду і ў хуткім часе адправяць сваіх прадстаўнікоў у сталіцу. Армія Бачэ-і-Сакао ў шмат якіх пунктах скарылася. Кароль Афганістану будзе абраны на Люйі-Джырзе—на вялікім нацыянальным зборы, які будзе ўтвораны з прадстаўнікоў усіх пляменьняў. Маршал Надыр-Хан прыедзе заўтра ў сталіцу".

17-га кастрычніка з Кабулу ад міністэрства замежных спраў Афганістану атрымана дадатковая радыёграма наступнага зьместу:

„Міністэрства замежных спраў Афганістану мае гонар давесьці да вашага ведама, што маршал Махамэд Надыр-Хан 16-га кастрычніка ўвайшоў у сталіцу. За зваю адданасьць і вялікія заслугі ён аднагалосна быў прызнаны афганскімі нацыянальнымі прадстаўнікамі. У зьвязку з гэтым міністэрства замежных спраў Афганістану ад імя ўраду выказвае жаданьне, каб добрасуседзкія адносіны, якія ўжо існуюць між абодвума ўрадамі, працягваліся найлепшым чынам і на самых моцных асновах".

Адказ ураду СССР.

9-га кастрычніка Народны Камісарыят Замежных Спраў накіраваў за подпісам нам. Наркома Замежных Спраў тав. Карахана міністэрству замежных спраў Афганістану наступны адказ:

«Народны Камісарыят Замежных Спраў, пацьвярджаючы атрыманьне радыёграммы міністэрства замежных спраў Афганістана ад 15 і 17 кастрычніка, мае гонар падцьвердзіць паведамленьне міністэрства аб тым, што маршал Махамэд Надыр-хан прызнаны афганскімі нацыянальнымі прадстаўнікамі, Народны Камісарыят Замежных Спраў з задаваленьнем прымае таксама заяву, зробленую ад імя афганскага ўраду аб тым, што добрасуседзкія адносіны, ужо існуючыя паміж абодвымі ўрадамі, будуць працягвацца найлепшым чынам і на самым моцным грунце.

Народны Камісарыят Замежных Спраў пацьвярджае ад імя ўраду СССР нязьменнасьць добрасуседзкіх адносін паміж дзьвума дзяржавамі, выражае гатоўнасьць разьвіваць і далей на базе існуючых згод у адпаведнасьці з інтарэсамі ўмацненьня незалежнасьці Афганістану ў яго гаспадарча-культурным прагрэсе.

Надыр-хан абвешчан нацыянальным гэроем.

ЛЁНДАН, 18-X. Рэйтэр паведамляе: «Водлуг вестак, якія прысылаюцца ў аўганскую місію ў Лёндане, новы кароль Надыр-хан абвешчан нацыянальным гэроем. Правадыры ўсіх пляменьняў прысягаюць на вернасьць новаму падышаху».

Аманула вітае Надыр-хана.

РЫМ, 18-X. Аманула паслаў Надыр-хану такую тэлеграму: «Прашу вас і ўсіх вашых супрацоўнікаў прыняць прывітаньне ад аўганца, які любіць сваю бацькаўшчыну.

Новыя навучальныя ўстановы ў БССР.

МАСКВА, 19-X. Саюзны Дзяржплян унёс у СНК СССР праэкт арганізацыі ў 1929-30 годзе сеткі навучальных устаноў па падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы саматужнікаў. У БССР маркуецца адчыніць дрэваапрацоўчы тэхнікум, дзьве прафшколы, 18 вучэбных майстэрняў, 2 паказальных пункты і курсы для тэхпэрсаналю тарпентыннай прамысловасьці. На арганізацыю школ асыгнуецца звыш 500 тысяч рублёў.

Акадэмік Альдэнбург С. Ф.—25 год на пасадзе абавязковага сэкратара Акадэміі Навук СССР.

ЛЕНІНГРАД, 17-X. У сувязі з 25-мі ўгодкамі працы на пасадзе абавязковага сэкратара Акадэміі Навук СССР акадэміка Альдэнбурга С. Ф., у Акадэміі атрыманы тэлеграфныя і пісьмовыя прывітаньні ад старшыні СНК СССР А. І. Рыкава, старшыні Дзяржпляну СССР Куйбышэўскага, Бухарына, сэкратара ЦВК СССР Энукідзэ, кіраўніка справамі СНК СССР Гарбунова, ад аддзелу навуковых устаноў пры СНК СССР, ад прэзыдэнта Акадэміі Навук акадэміка А. П. Карпінскага і віцэ-прэзыдэнта Цорхмана, ад прэзыдыуму С.-Г. Акадэміі імя Леніна, ад старшыня камісіі па складаньні ўсесаюзнага індэксу навуковай літаратуры Шмідта, ад шэрагу акадэмікаў і шматлікіх навуковых устаноў Ленінграду і Масквы.

Прычыны ненармальных гандлёвых зносін між СССР і Чэхаславакіяй.

ПРАГА, 16-X. На прыёме журналістаў у паўнамоцным прадстаўніцтве выступіў новы гандлёвы прадстаўнік т. Сахараў.

Тав. Сахараў зазначыў, што разьвіцьцю нармальных гандлёвых зносін перашкаджае адсутнасьць гандлёвага дагавору і адсутнасьць прызнаньня савецкага ўраду дэ-юрэ з боку Чэхаславакіі.

Сацыял-дэмакратычная «Права Ліду» зазначае, што супроць аднаўленьня ў поўнай меры дыпляматычных зносін між СССР і Чэхаславакіяй супярэчыць лідэр нацыянал-дэмакратаў Брамарж, „улюбёнаю мэтаю якога зьяўляецца барацьба супроць СССР".

За ленінскую лінію партыі

Камсамол працаваў і будзе працаваць пад непасрэдным кіраўніцтвам ленінскай партыі

Рашучы адпор фракцыйнай барацьбе правай апазыцыі

Пастанова бюро ЦК ЛКСМБ ад 16-X-1929 г.

Абгаварыўшы матар'ял зьмешчаны ў «Комсомольской Правде» аб адкрытых права-апартуністычных вылазках і фракцыйнай рабоце правых элементаў супроць лініі партыі ў шэрагу камсамольскіх ячэек Масквы на чале з былым сэкратаром ЦК УсеЛКСМ Матвеевым, Бюро ЦК ЛКСМБ з вялікім абурэньнем асуджае гэтыя анты-партыйныя выступленьні і спробы правых зьбіць УсеЛКСМ з правільнай бальшавіцкай лініі і супроцьпаставіць яго ўсёй партыі і старым загартаваным бальшавіцкім кадрам нашае партыі.

Гэтыя антыпартыйныя выступленьні гавораць аб тым, што ня гледзячы на неадначасовыя напярэджаньні партыяй і на тое, што ўсе панікёрскія сьцвярджэньні правых даўно ўжо абвергнуты жыцьцём, аб чым найлепш сьведчыць выкананьне з перавышэньнем першага году пяцігодкі; наперакор гэтаму правая апазіцыя ўжо стала на шлях фракцыйнай барацьбы супроць генэральнай лініі партыі, і ідзе па шляху былой трацкісцкай і іншых ухілісцкіх апазіцый у сваіх формах барацьбы з партыяй.

Бюро ЦК ЛКСМБ рашуча пратэстуе супроць хлусьлівых ліквідатарскіх заяў Матвеева і інш. аб тым, што „старая гвардыя як рэвалюцыянізуючы фактар, сябе зжыла", што старыя кадры „губляюць чуцьцё" і г. д. Такія заявы толькі выкарыстоўваюцца правымі для фракцыйнай барацьбы з партыяй і супроцьпастаўленьне камсамолу партыі.

Бюро ЦК ЛКСМБ упэўнена, што ўвесь Саюз і ЛКСМБ пад цьвёрдым кіраўніцтвам ЦК УсеЛКСМ і партыі цьвёрда і пасьлядоўна разгортваючы ў далейшым рашучую барацьбу з правым ухілам і прымірэнцтвам, як галоўнай небясьпекай сучаснасьці, асабліва з канкрэтнымі праявамі правага апартунізму на практыцы, вядучы неаслабную барацьбу з рэшткамі контр-рэвалюцыйнага троцкізму і „левых" загібамі, якія зьяўляюцца нічым іншым, як адгалоскамі трацкізму, тыпу Шацкіна, Стэна, Кастрова і г. д., дасьць бязьлітасны адпор усім спробам супроцьпаставіць комсамол партыі. **Комсамол працаваў і будзе працаваць пад непасрэдным цьвёрдым кіраўніцтвам нашай ленінскай партыі.** ЦК ЛКСМБ патрабуе прыняцьця самых рашучых ідэёва-арганізацыйных мер у адносінах да тых, хто вядзе фракцыйную работу ў нашых шэрагах.

Бюро ЦК ЛКСМБ цалкам ухваляе пастанову Бюро ЦК УсеЛКСМ аб вывадзе тав. Бобрышава з складу членаў бюро ЦК УсеЛКСМ (сылога рэдактара „Комсомольской Правды", аслабанёнага ад работы за няпрызнаньне і спробы абвергнуць політычную правільнасьць рашэньняў Бюро ЦК ад 9-IX аб „К. П.", адобранага ЦК УсеКП(б), і лічыць, што гэта мера вараз зьяўляецца зусім правільнай і неабходнай, бо той, хто ня хоча зразумець напярэджаньняў, якія рабіліся камсамолам, ня можа быць у кіраўніцтве двухмільённага чырвонаармейскага камсамолу. Ліст тав. Бобрышава ў ЦК, дзе ён поўнасьцю салідарызуецца з пазіцыяй Шацкіна, Стэна, Кастрова і спрабуе навязаць камсамолу іх шкодныя погляды, сьведчыць аб усугубленьні памылак.

„Яўна фальшывым і заведама хлусьлівым зьяўляецца сьцьвярджэньне тав. Бобрышава аб тым, што артыкул тав. Стэна выходзіў з курсу VI канфэрэнцыі УсеЛКСМ на разгортваньне тэарытычнага руху сярод моладзі і з ленінскіх паказаньняў па крытычнаму ўцямленьню ведаў.

Артыкул тав. Стэна, дэкляруючы ў партыі і камсамоле «права на сумненьне і на ўхілы ад партыйнай лініі", прасякнуты недавер'ем партыйнаму кіраўніцтву і ня мае нічога агульнага з ленінскім вучэньнем і з рашэньнямі VI канфэрэнцыі УсеЛКСМ. Размовы аб тым, што неабходна «падяргаць усё сумненьню», „правяраць на сваім асабістым вопыце", якія вядзе тав. Стэн, у нашых умовах ёсьць размовы супроць ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі і зразумела, што будуць падрываць адзінства шэрагаў партыі. Камсамол нікому не дазволіць расхіставаць дысцыпліну ў партыі і камсамоле і сеяць у яе шэрагах сумненьне ў правільнасьці генэральнай лініі партыі. ЛКСМБ ва ўсёй сваёй рабоце дасьць рашучы адпор гэтым дробна-буржуазным тэндэнцыям.

Выступленьне тав. Бобрышава па пытаньнях аб пазіцыі Шацкіна і Стэна бязумоўна зьвязана з яго паводзінамі на VI Усесаюзнай канфэрэнцыі, дзе ён спрабаваў падмяніць барацьбу з правым ухілам барацьбой з дзяляцтвам, на што VI канфэрэнцыя, як і ўвесь камсамол, далі рашучы адпор такім спробам.

Мы павінны, праводзячы лёзунг партыі аб барацьбе на два франты, згрупоўваючы асноўны адпор на праваму ўхілу, як галоўнай небясьпецы сучаснасьці, не паслабляць барацьбы супроць рэшткаў контр-рэвалюцыйнага трацкізму і «левых» загібаў, выхоўваючы масы камсамольцаў у духу рашучай барацьбы за генэральную лінію партыі.

Усе сілы на выкананьне пяцігодкі!

Няхай жыве цьвёрдае бальшавіцкае ленінскае кіраўніцтва партыі камсамолам!

Няхай жыве ленінскі ЦК УсеЛКСМ

Барацьба між кітайскімі генэраламі

Паўстаньне войска Чан-Чэн-У.

У ВУХУ НАКІРАВАНЫ ДВА ЗЬНІШЧЫЦЕЛІ.

ШАНХАЙ, 19-X. У сувязі з паўстаньнем быўшага войска Чан-Чэн-У ў Вуху (правінцыя Аньхуэй), сюды пасланы з Цьвю-Цзяну і Нанкіну два дадатковых ангельскіх зьнішчыцелі, не зважаючы на тое, што ангельскі зьнішчыцель, які знаходзіўся ўжо раней у Вуху, напярэдадні ўночы прыняў на борт ангельскіх жанчын і дзяцей, што жывуць у Вуху.

Падрабязнасьці паўстаньня да гэтага часу застаюцца няяснымі. Нанкінская ўлада заявляе, нібыта нанкінскае войска поўнасьцю заўладала становішчам у Вуху. Агэнцтва Рэйтэра паведамляе, што ў сувязі з паведамленьнямі з Вуху перарвана тэлеграфная сувязь між Нанкінам і Ханькоу і што Чан-Кай-Шы адклаў сваё падарожжа, як меркаваў, у Ханькоу.

Чан-Кай-Шы на чале 16.000 выехаў супроць Гамінцьзюну.

ШАНХАЙ, 18-X. Чан-Кай-Шы на чале 16.000 войска выехаў у напрамку на Ханькоу для кіраваньня ваеннымі апэрацыямі супроць Гамінцьзюну.

* * *

ШАНХАЙ, 18-X. Вайсковая ўлада выдала загад аб тым, каб былі ўжыты рашучыя захады для спыненьня падвозу харчу на тэрыторыю, занятую Гамінцьзюнам.

* * *

ШАНХАЙ, 18-X. Водлуг паведамленьня Рэйтэра, жалезная дывізія Чан-Фа-Гуя адступіла з Квэйміну ў напрамку да заходняй часткі Хуначьскай правінцыі. Урадавае войска выступіла ўсьлед за адступаючай дывізіяй.

* * *

ШАНХАЙ, 19-X. Нанкінскі ўрад загадаў раней пасланаму ў Кантон войску вярнуцца ў Нанкін і спыніць экспэдыцыю супроць Чан-Фа-Гуя. Цзянцьзінскае войска таксама варочаецца ў сваю правінцыю.

* * *

ШАНХАЙ, 18-X. Генэрал Тан-Шэн-Чы агласіў заяву, у якой ён падтрымлівае цэнтральны ўрад.

Водгукі аб працэсе—38.

ПЭЙПІН, 18-X. „Норд Чайна Дэйлі Ньюс" зьмяшчае артыкул аб працэсе 38-мі ў Харбіне. Падрабязна апісваючы працэдуру суду, газэта робіць такі вывад: „Харбінскі працэс войдзе ў гісторыю, як адзін з самых яскравых прыкладаў таго, якою зьяўляецца кітайская юстыцыя. Працэс даў яшчэ адзін малюнак няпрыгоднасьці кітайскага суду і ўсёй кітайскай сыстэмы юстыцыі".

У кітайскіх засьценках.

Рабочыя змагаюцца з фашызмам.

Забастоўка латвійскіх рабочых праходзіць з вялікім посьпехам

С.-Д. УГАВАРВАЮЦЬ РАБОЧЫХ НЯ ІСЬЦІ ЗА МАСКОЎСКІМІ ЛЁЗУНГАМІ. ПАЛІЦЫЯ РАЗГАНЯЕ І АРЫШТОВУЕ ДЭМАНСТРАНТАЎ.

РЫГА, 18-X. Забастоўка, абвешчая латвійскімі рабочымі арганізацыямі ў знак пратэсту супроць новага закону аб больнічных касах, праходзіць з вялікім посьпехам. У Рызе бастуюць партовыя рабочыя, рабочыя трамваю, камунальнікі і каля 70 проц. фабрычна-заводзкіх рабочых. Урадавыя ўстановы, пошта, тэлеграф, чыгуначныя станцыі, вадаправод і электрастанцыі заняты войскам і атрадамі фашысцкай арганізацыі.

У правінцыйных гарадох забастоўкі праходзяць яшчэ з большым посьпехам. Паліцыя разганяе і арыштоўвае ўсіх, хто толькі зьбіраецца. Сёньня ў Рызе арыштавана каля 80 чалавек.

Не зважаючы на заклік сацыял-дэмакратаў ня ўдзельнічаць у дэманстрацыі, сёньня раніцаю 1.500 рабочых выйшла на дэманстрацыю з чырвонымі сьцягамі і камуністычнымі лёзунгамі. Дэманстрацыя была разагнана. Увечары сацыял-дэмакраты агласілі бюлетэнь, у якім усімі спосабамі ўгаворваюць рабочых ня ісьці за маскоўскімі лёзунгамі, адмовіцца ад парад маскоўскіх агэнтаў, якія ўносяць раскол у рабочы рух, і не рабіць з аднадзённай забастоўкі—усеагульную. Трэба адзначыць, што сацыял-дэмакратычныя рабочыя распачалі ўчора баставаць не а поўначы, як заклікалі сацыял-дэмакратычныя лідэры, але а 6-7 гадз. вечара.

Пратэст рэвалюцыйнай моладзі

супроць зьніжэньня дапамогі беспрацоўным і ўзмоцненай эксплёатацыі моладзі.

БЭРЛІН, 18-X. Учора бэрлінская рэвалюцыйная моладзь правяла дэманстрацыю пратэсту супроць зьніжэньня дапамогі беспрацоўным і ўзмоцненай эксплёатацыі моладзі. Паліцыя, аднак, перашкодзіла дэманстрацыі і, пусьціўшы ў ход гумовыя дубінкі, пачала арыштоўваць дэманстрантаў. Адначасова «сталёвы шлем» назначае на нядзелю фашысцкія дэманстрацыі, так і камуністычную контр-дэманстрацыю забараніў.

Бэрлінская арганізацыя камуністычнай партыі і «Ротэ Фанэ» заклікаюць працоўных Берліну зьбірацца ў рабочых кварталах для таго, каб даць належны адказ на фашысцкія правакацыйныя дэманстрацыі. У апошнюю хвіліну бэрлінскі паліцэй-прэзыдэнт, як меркаваньня на нядзелю фашысцкія дэманстрацыі, так і камуністычную контр-дэманстрацыю забараніў.

Буйныя працэсы супроць камуністаў

ВЕНА. У Баўгарыі надыходзіць шэраг буйных палітычных працэсаў на падставе закону аб абароне дзяржавы. 21-га кастрычніка ў акруговым судзе будзе разглядацца справа сяброў ЦК баўгарскай кампартыі. 23-га кастрычніка ў Сьлівэнскім акруговым судзе распачнецца працэс некалькіх працаўнікоў рабочай партыі ў Сьлівэне, арыштаваных у сувязі з 1 жніўня. Абодвы працэсы прыцягваюць вялікую ўвагу мас.

Фашысты дубінкамі распраўляюцца з рабочай моладзьдзю.

ВЕНА. 11 кастрычніка ў 7-м раёне Вены адбыўся сход фашысцкай моладзі, на якім былі і бурныя выступленьні камсамольцаў.

Некалькі рабочых-падлеткаў было паранена і потым перададзена фашыстамі ў рукі паліцыі. „Ротэ Фанэ" паведамляе, што фашысты накінуліся з раменьнямі і кіямі на камсамольцаў, якія пратэставалі супроць фашысцкіх выступленьняў. На вуліцы перад памяшканьнем, дзе адбываўся сход, згрупаваліся рабочыя і адбыліся антыфашысцкія дэманстрацыі; паліцыя накінулася на дэманстрантаў з гумовымі дубінкамі. Не зважаючы на гэта, дэманстрацыі ня спыняліся. Здарыліся новыя сутычкі між фашыстамі і рабочымі. Два фашысты былі моцна зьбіты.

КІТАЙСКАЯ ЦАЦКА Ў РУКАХ ІМПЭРЫЯЛІСТАЎ.

Рэзалюцыя Бюро ЦК КП(б)Б

па справе Аршанскай дзевяцігадовай чыгуначнай школы.

1, Заслухаўшы паведамленьне ЦКК РСІ па справе Аршанскай чыгуначнай 9-цігадовай школы, у сувязі з праведзеным рассьледваньнем камісіяй НК РСІ і ЦК Працасьветы фактаў групавога звальненьня з працы настаўнікаў і самагубства на гэтай глебе настаўніка Шастакова,—Бюро ЦК канстатуе, што:

а) Аддзел Асьветы і Дорпроса МББ чыгункі, будучы ў курсе дрэнных настаноўкі работы ў школе, ненармальных узаемаадносін паміж пед. калектывам, мясцовымі і вучнёўскімі арганізацыямі, не прынялі ніякіх мер да ўхіленьня недахопаў і сваім бяздзейнічаньнем спрыялі паглыбленьню маючыхся недахопаў і разлажэньню школы.

б) Як з боку паказаных арганізацый, так і з боку адміністрацыі школы зусім адсутнічала палітычнае і вучэбна-выхаваўчае кіраўніцтва школай, ня прымаліся ніякія меры да наладжваньня жыцьця школы, калі загадчык школы нават ня ведаў яе сапраўднага становішча і праводзіў палітыку безадказнага ўхіленьня і нэйтралізму, што прывяло не да дзелавой спаянасьці школьнага калектыву, а да яго разрозьненасьці і дэзарганізацыі.

в) Палітычна-выхаваўчая і праф. работа сярод школьнага калектыву не вялася, перад настаўніцтвам ня была завострана ўвага на разгортваньні самакрытыкі і барацьбы з недахопамі ў школе і на зжываньні тых непэдагагічных прыёмаў і мер узьдзейнічаньня на вучняў, якія мелі месца ў школе.

г) Палітычнае кіраўніцтва школай з боку мясцовых чыгуначных, партыйных, прафэсыянальных і камсамольскіх арганізацый і партыйна-камсамольскай часткі настаўнікаў, працуючых у школе—адсутнічала, дзякуючы чаму, ня будучы ў курсе жыцьця школы, па-першае, яны свае сова не сыгналізавалі аб маючыхся ненармальнасьцях у школе, а, падругое, прынялі ўжо амаль што пасьля поўнага разлажэньня школы рад такіх мер, якія ня толькі не садзейнічалі аздараўленьню школы, а, наадварот, прывялі да яшчэ большага яе разлажэньня, як: няправільнае групавое звальненьне настаўніцтва, неабгрунтованыя абвінавачаньні супроць паасобных настаўнікаў, асабліва супроць настаўніка Шастакова, які скончыў на гэтай глебе жыцьцё самагубствам. Пры гэтым абвінавачаньне супроць групы настаўнікаў (11 чал.) за выключэньнем 2-х настаўнікаў, паводзіны якіх асуджаны, аказаліся не пацьверджанымі, што яшчэ больш дыскрэдытавала дзейнасьні ў гэтай справе з боку Аршанскіх устаноў.

2. Гэтая справа зьяўляецца не адзіным яскравым прыкладам нездавальняючага кіраўніцтва школьнай справай з боку органаў НК Асьветы.

3. На падставе тых даных аб буйнейшых недахопах кіраўніцтва школьным будаўніцтвам з боку органаў НК Асьветы, якія былі выяўлены ў радзе абсьледваньняў ЦКК РСІ на працягу 1928-29 г. (Землябудаўнічы тэхнікум, Мэхтэхнікум, інстытут глухаямых і г. д.), —Бюро ЦК адзначае ў рабоце культасьветных устаноў НК Асьветы рад вельмі значных недахопаў, якія характарызуюць зусім нездавальняючае кіраўніцтва НК Асьветы школьным выхаваньнем, асабліва ў гэтых установах НК Асьветы ёсьць рад выпадкаў непэдагагічных метадаў выхаваньня і выкладаньня ў школах, грубыя адносіны і меры фізычнага ўдзіву на вучняў, адрыў ад грамадзкае працы, нацыянал-дэмакратычныя, шавіністычныя настроі і інш. зьявішчы, зусім нецярпімыя ў савецкай школе і якія зьяўляюцца перажыткамі мэтадаў выхаваньня старой буржуазнай школы; слабая настаноўка выхаваўчае працы, калі галоўная ўвага зьвярталася на ўсваеньне фармальных ведаў, зусім слабое разгортваньне самакрытыкі як работы кіруючых органаў, так і работы саміх устаноў, выпадкі замазваньня недахопаў і кругавая парукі. Пры чым нездавальняючае кіраўніцтва НК Асьветы яшчэ больш падкрэсьліваецца тым, што большасьць недапушчальных скажэньняў былі выяўлены памімо НК Асьветы, на асноае заяў у органы РСІ і выкрыцьця ў друку. Органы НКАсьветы да гэтага часу не наладзілі належнага, сыстэматычнага, жывога кіраўніцтва ўсімі галінамі работы, жыцьця культасьветных устаноў, часта праводзячы дзяличэскую, прымірэнчую лінію барацьбы з паасобнымі недахопамі, альбо нават імкнучыся замазваць клясавыя скажэньні ў рабоце школ.

Нездавальняючая дзейнасьць НКАсьветы ў барацьбе з недахопамі і скажэньнямі клясавае лініі ў школьным выхаваньні прыводзіла на мясцох да недацэнкі значэньня сацыялістычнага выхаваньня дзяцей, як адной з форм клясавай барацьбы з варожай рабочай клясе кулацкай буржуазнай ідэалёгіяй. Ва ўмовах абвастрэньня клясавае барацьбы і наступу на капіталістычныя элементы ў краіне, калі ў школе праваднікам супраціўленьня капіталістычных элементаў зьяўляецца невялічкая частка настаўніцтва, яўна і таемна варожых дыктатуры пралетарыяту, з якой неабходна весьці рашучую барацьбу, як сіламі шырокай савецкай грамадзкасьці, так-сама і ў першую чаргу самім настаўніцтвам, якое павінна ачышчаць свае рады ад варожага элемэнту,—адсутнасьць яльбо слабасьць барацьбы з дробна-буржуазнай ідэалёгіяй у школе прыводзіць да паслабленьня пазыцый нашае партыі сярод значных пластоў настаўніцтва, актыўна адданага савецкай уладзе, якое актыўна вядзе барацьбу за ідэалёгію рабочае класы і лінію партыі і тым самым узмацняе ўплыў варожай часткі на частку хістаючагася настаўніцтва, у той жа час, калі за першую частку хістаючыхся павінна весьціся барацьба за іх пераход на пазыцыі ажыцьцяўленьня ідэалёгіі рабочае клясы, шляхам рашучага ачышчэньня школы ад варожых элементаў.

Такое ідэалёгічнае становішча і маючыяся недахопы савецкае школы зьяўляюцца ня толькі вынікам слабога кіраўніцтва органаў НКАсьветы, але і вынікам слабога і нездавальняючага кіраўніцтва парт., праф. і камсамольскіх органаў і таго, што вакол культасьветных устаноў і ў першую чаргу школ не сканцэнтравана ўвага рабочых мас і шырокай савецкай грамадзкасьці. У выніку гэтага, замест выкананьня дырэктыў партыі аб рашучай барацьбе з элемэнтамі дробна-буржуазнай ідэалёгіі ў школе, раней за ўсё сіламі асноўнага пласта, адданага савецкай уладзе настаўніцтва, за апошні час наглядаецца недапушчальнае і безадказнае абагуленьне абвінавачаньня ўсяго настаўніцтва ў нелёяльнасьці да савецкае ўлады і яго рэакцыйнасьці.

Бюро ЦК, у мэтах узмацненьня кіраўніцтва школьнай справай з боку НКАсьветы, Дорота. асьветы МББ чыгункі і акруговых партыйных і праф. органаў, абавязвае апошніх прыняць тэрміновыя меры зжыцьця недахопаў у школьным выхаваньні, выкліканых нездавальняючым кіраўніцтвам органаў НКАсьветы; у гэтых мэтах Бюро ЦК лічыць неабходным паставіць даклад НКАсьветы аб становішчы народнае асьветы ў БССР на бліжэйшым пленуме ЦК КП(б)Б.

Бюро ЦК прымае да ведама пастановы ЦКК-РСІ аб мерах узьдзейнічаньня ў адносінах органаў і асоб, вінаватых у стварэньні становішчы ў Аршанскай 9-гадовай школе, асабліва адносна акруговай РСІ, парт. і праф. органаў, дапусьціўшых халатныя адносіны ў пытаньні ўхіленьня недахопаў школы, адсутнасьць якой-бы то ні было праверкі прад'яўленых групе настаўніцтва абвінавачаньняў, безадказнае штэмпэляваньне неправераных абвінавачаньняў, местнічаскую ўпартасьць і нежаданьне прызнаць свае памылкі ў гэтай справе. Бюро ЦК з свайго боку ставіць у віну Аршанскаму АК непрыняцьце ім мер да правільнага вырашэньня справы і ўпартае нежаданьне прыняць да выкананьня зусім правільных прапаноў ЦКК-РСІ.

Бюро ЦК, разглядзеўшы пастановы Прэзыдыуму ЦКК па гэтаму пытаньню, толькі ў выніку адбыўшыхся пастаноў Аршанскага АК аб прызнаньні ім сваёй віны і памылковасьці паводзін адносна пастаноў ЦКК-РСІ абмяжоўваецца на гэты раз папярэджаньнем Аршанскага АК аб больш правільным кіраўніцтве як агогул, так і ў пытаньнях школьнае справы ў асаблівасьці.

Бюро ЦК прымае да ведама пастановы ЦК саюзу працасьветы ў адносінах мер узьдзейнічаньня на работнікаў аддзелу асьветы і Дорпроса МББ чыгункі, вінаватых у гэтай справе, і зварочае ўвагу праўленьня МББ чыгункі і ЦК працасьветы на неабходнасьць рашучага узмацненьня кіраўніцтва чыгуначнымі школамі ў межах Беларусі.

Бюро ЦК згаджаецца з пастановай прэзыдыуму ЦКК аб недапушчальнасьці абвінавачаньняў камісіі ЦКК-РСІ і ЦК працасьветы з боку газэт „Савецкая Беларусь" і „Чырвоная Зьмена", паколькі інфармацыя гэтых газэт аб справе Аршанскай 9 гадовай школы, на гледзячы на вядомыя ім вынікі рассьледваньня, фактычна была накіравана на замазваньне недапушчальных паводзін і пастаноў па гэтай справе з боку арганізацый Аршанскае акругі.

ЗАМАЦУЕМ ПОСЬПЕХІ III ПАЗЫКІ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ.

Па БССР падпіска на III пазыку індустрыялізацыі дасягнула 139,1% кантрольных лічбаў.

Нельга спыніцца на гэтых дасягненьнях. Трэба падпіску на пазыку разгортваць у вёсцы, трэба разгарнуць работу па афармленьні падпіскі на пазыку.

КАНТРОЛЬ РАБОЧЫХ ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ ВЫРАЗНАСЬЦЬ.

ПАТРЭБНА ХУТКАЕ АФАРМЛЕНЬНЕ ПАДПІСКІ НА ПАЗЫКУ.

Разьмяшчэньне пазыкі сярод арганізаванага гарадзкога пралетарыяту СССР можна лічыць бязумоўна **пасьпяховым**. Але было-б крайне няправільным ацэньваць бязумоўны посьпех разьмяшчэньня пазыкі сярод гарадзкіх рабочых і служачых, **як закончаны практычны посьпех усёй крэдытнай апэрацыі**. Нават у гарадзкім сэктары гэты посьпех трэба яшчэ замацаваць, ператварыць яго з колькаснага ў якасны, у адваротным выпадку клясавае падтрыманьне, зробленае пазыцы арганізаваным пралетарыятам, можа аказацца, у вядомай ступені тэхнічна неафармаваным, бесрадметным, вынікарыстаным і не даведзеным да канца. Справа ў тым, што не ва ўсіх раёнах установы і арганізацыі, якія разьмяшчалі пазыку, своечасова і поўна рэалізавалі заяўкі рабочых калектываў на пазыку ў вызначаных імі сумах. Многія раёны не забясьпечваюць гэтых заявак абумоўленымі ўзносамі ў устаноўленыя тэрміны.

Бліскуча праведзеная пралетарыятам у сваім асяродку падпіска на 3-ю пазыку індустрыялізацыі крэдытнымі ўстановамі і грамадзкімі арганізацыямі афармлена толькі ў суме 292,5 млн. руб. Інакш кажучы, толькі каля 60 проц. падпіскі арганізаваных у прафсаюзы рабочых і служачых афармлена і забясьпечана ўстаноўленымі ўзносамі, астатнія 40 проц. да афармленьня ня могуць быць прыняты ў канчатковы практычны вучот, **ня могуць быць уключаны ў плян фінансаваньня капітальнага будаўніцтва**, пазбаўляючы плянуючыя арганізацыі магчымасьці цьвёрдага плянавага разьліку на прыток паказаных сродкаў у бюджэт на сацыялістычнае будаўніцтва. Гэты разрыў паміж яскрава выяўленай воляй рабочых мас і тэхнічным яе афармленьнем адпаведным апаратам павінен быць ліквідаваны і ў самы кароткі тэрмін.

Баявым дзеяньнем нізавой камісіі садзейнічаньня зараз павінна зрабіцца своечасовая і дакладная праверка афармленьня прынятай у яе калектывы падпіскі, а таксама праверка выразнасьці правядзеньня ўстаноўленых узносаў за пазыку ў вызначаныя тэрміны. Ніводная камісія садзейнічаньня ня можа лічыць сваю работу па разьмяшчэньні 3-й пазыкі індустрыялізацыі закончанай, пакуль зробленыя рабочымі і служачымі заяўкі на поўныя сумы падпіскі ня будуць тэхнічна афармлены і замацаваны вызначаным грашовым узносам.

Райённыя, гарадзкія, абласныя і вышэйстаячыя камісіі садзейнічаньня павінны бязупынна і сыстэматычна правяраць выкананьне гэтай першачарговай і важнейшай работы сеткі нізавых камісій. **Пэўным злачынствам супроць сацыялістычнай індустрыялізацыі зьяўляецца затрыманьне ў перадачы зьбіраемых па пазыцы чарговых узносаў у адпаведныя крэдытныя ўстановы.**

ПРАСУНУЦЬ ПАЗЫКУ У ВЁСКУ.

Калі паказаныя вышэй прадпасылкі забясьпечваюць у горадзе **замацаваньне посьпеху разьмяшчэньня 3-й пазыкі індустрыялізацыі**, дык адносна вёскі пытаньне ставіцца больш востра. Там трэба гаварыць не аб замацаваньні посьпеху, а аб яго арганізацыі, бо да гэтага часу разьмяшчэньне 3-й пазыкі індустрыялізацыі сярод сялянства ня можа быць прызнана колькі-небудзь пасьпяхова наладжаным. Сапраўды, у агульнай суме на пазыку 638,7 млн. руб. сума падпіскі сярод сялянства дасягае ледзь толькі 68,7 млн. руб. Калі кантрольныя лічбы па разьмяшчэньні сярод арганізаваных працоўных гораду выкананы ўжо на 108,3 проц., дык па сялянству кантрольная лічба выканана толькі па 31,4 проц. Водлуг арыентыровачных падлікаў, доля ўдзелу сялянскіх гаспадарак у пазыках, у сяроднім, складае (бяз 3-й пазыкі індустрыялізацыі) каля 8 руб. на двор. Няма чаго і гаварыць, што абсалютная недастатковасьць вынікаў разьмяшчэньня 3-й пазыкі па сяле і павольны тэмп нарастаньня сумы рэалізацыі пазыкі станоўча дыктуюць нам зьвярнуць усю сваю ўвагу на гэты сэктар работы, тым больш, што пасьпяховае разьмяшчэньне пазыкі сярод працоўнага сялянства набывае для нас ня толькі таксама ня была як трэба замацавана, **і гатоўнасьць рабочых мас калектыўна здаваць свае аблігацыі на захаваньне ў ашчадкасы і крэдытныя ўстановы ня была тэхнічна афармавана.** Няма чаго казаць, што гэтыя абставіны ў вядомай ступені паслабляюць посьпех 2-й пазыкі індустрыялізацыі, дэзарганізуюць плянавасьць будаўніцтва, паслабляючы яго тэмп і пазбаўляючы плянуючыя органы магчымасьці цьвёрдых разьлікаў пры вызначэньні тэмпу, аб'ёму і размаху капітальнага будаўніцтва. Грамадзкія арганізацыі, галоўным чынам, нізавыя камісіі садзейнічаньня дзяржкрэдыту і ашчадным касам, павінны пебач з непаслабленай работай па разьмяшчэньні 3-й пазыкі індустрыялізацыі разгарнуць сярод калектываў рабочых і служачых шырокую растлумачальную работу аб патрэбе калектыўна або індывідуальна здаваць атрыманыя на рукі аблігацыі на захаваньне ў ашчадныя касы і крэдытныя ўстановы.

Падпісваюцца на 3-ю пазыку.

гаспадарчае, фінансавае, але і вялікае палітычнае значэньне.

Аграмаджаны сэктар сельскае гаспадаркі, арганізацыі сялянскай беднаты, партыйная, камсамольская, прафсаюзныя ячэйкі на сяле выяўляюць сабой даволі шырокі грунт, апіраючыся на які можна арганізаваць інтэнсыўную работу па разьмяшчэньні пазыкі сярод працоўнага сялянства так, каб забясьпечыць выкананьне кантрольга заданьня ў 200 млн. руб.—з агульнай сумы пазыкі ў 750 млн. руб. Пасылка ў вёску рабочых брыгад, сацыялістычнае спаборніцтва паміж паасобнымі вёскамі, мабілізацыя грамадзкай думкі працоўнага сялянства пры дапамозе сельскіх камісій садзейнічаньня і згуртаваньня навакол іх усіх грамадзкіх элемэнтаў вёскі ня могуць ня даць сур'ёзнага палітычнага эфэкту, ня могуць не ўскалыхнуць усёй масы працоўнага сялянства і не арганізаваць яго волі ў карысьць калектыўнага падтрыманьня сацыялістычнай індустрыялізацыі.

ЗА ДОЎГАТЭРМІНОВАСЬЦЬ КРЭДЫТУ, ЗА ЎТРЫМАНЬНЕ АБЛІГАЦЫЙ.

Нельга выпускаць з-пад увагі аднэй вельмі важнай акалічнасьці, якая знаходзіцца ў непасрэднай сувязі з рацыянальным выкарыстаньнем сродкаў, што зьбіраюцца па 3-й пазыцы індустрыялізацыі. Справа ідзе аб ўтрыманьні на руках падпісчыкаў раней выпущчаных пазык, у прыватнасьці II-й пазыкі індустрыялізацыі. За апошнія месяцы мы наглядаем значную «сброску» 2-й пазыкі індустрыялізацыі ў крэдытныя ўстановы і ашчадныя касы. Своечасова ўзьнятая растлумачальная кампанія за захаваньне гэтай пазыкі на руках у трымацеляў аблігацый, пазбаўляючы сярод працоўнага сялянства ад пасьцягвацьця ашчадкасы і крэдытныя ўстановы ня была тэхнічна афармавана. Няма чаго казаць, што гэтыя абставіны ў вядомай ступені паслабляюць посьпех 2-й пазыкі індустрыялізацыі, дэзарганізуюць плянавасьць будаўніцтва, паслабляючы яго тэмп і пазбаўляючы плянуючыя органы магчымасьці цьвёрдых разьлікаў пры вызначэньні тэмпу, аб'ёму і размаху капітальнага будаўніцтва. Грамадзкія арганізацыі, галоўным чынам, нізавыя камісіі садзейнічаньня дзяржкрэдыту і ашчадным касам, павінны пебач з непаслабленай работай па разьмяшчэньні 3-й пазыкі індустрыялізацыі разгарнуць сярод калектываў рабочых і служачых шырокую растлумачальную работу аб патрэбе калектыўна або індывідуальна здаваць атрыманыя на рукі аблігацыі на захаваньне ў ашчадныя касы і крэдытныя ўстановы.

Наш лёзунг: „Ніводнага сьвядомага пралетарыя, які-б ня здаў аблігацый на захаваньне ў ашчадныя касы!"

Нізавым камісіям садзейнічаньня трэба своечасова паклапаціцца: 1) аб увядзеньні сыстэматычнай канкрэтнай работы ў сваіх калектывах па растлумачэньні патрэбы забясьпечыць дзяржаве доўгатэрміновасьць крэдыту, які атрымліваецца на пазыках; 2) аб праверцы работы крэдытных устаноў па своечасовай падрыхтоўцы да афармленьня прыёму ад калектываў на захаваньне аблігацый 3-й пазыкі індустрыялізацыі з такім разьлікам, каб гэта работа была выразна праведзена і скончана яшчэ ў пэрыяд плацяжоў па пазыцы.

Усе камісіі садзейнічаньня, усе грамадзкія арганізацыі на прадпрыёмствах і ў установах павінны арганізаваць сапраўдны рабочы кантроль над работай крэдытных устаноў па абслугоўваньні масавага трымаценя пазык.

Кантроль шырокіх рабочых мас над работай нашых крэдытных устаноў забясьпечыць выразнасьць іх работы ў паказаным вышэй кірунку.

Пільная ўвага рабоце па замацаваньні посьпеху нашых пазык індустрыялізацыі.

І. Эпштэйн.

Чыгуначнікам трэба падцягнуцца

Пленум Менскага Вучпрофсфачу МБВ чыгункі заслухаў даклад вучастковага камітэту аб рэалізацыі 3-й пазыкі.

— Сума падпіскі сярод чыгуначнікаў вучастку складае 159.320 рублёў. Падпіскай ахоплены 85 проц. рабочых і служачых. Рэалізацыя сярод сезонных рабочых праводзіцца слаба.

Пытаньне аб пазыцы амаль не высьвятлялася ў пасьценгазэце; шэфскія арганізацыі ня прымалі ўдзелу ў рэалізацыі пазыкі сярод працоўнага сялянства. Прафактыў не выкарыстоўваўся для высьвятленьня палітычнай важнасьці падпіскі на 3-ю пазыку.

— Кантрольная лічба ў 250 тысяч рублёў павінна быць выканана.

Ком.

Замацуем праробленую працу.

(Магілеўская акруга).

Вызначаная кантрольная лічба 3-й пазыкі па акрузе выкананa на 121,5 проц.—падпіска дала 1313855 р.

Гаворачы аб пасьпяховай падпісцы сярод рабочых, нельга не закрануць таго, што сярод сялянства 3-я пазыка рэалізавана недастаткова.

Калі на сёньняшні дзень распаўсюджаньне пазыкі сярод рабочых і служачых дасягнула 137 проц. кантрольнае лічбы, то сярод сялянства мы маем усяго толькі 62 проц.

Па некаторых раёнах акругі—Бялынецкім, Чырвонапольскім і Чавускім рэалізавана пазыка на 24-30 проц. Бязумоўна, гэтую лічбу ні ў якім разе нельга лічыць здавальняючай.

Зараз трэба прыняць самыя рашучыя меры да ўзмацненьня тэмпу распаўсюджаньня пазыкі сярод сялянства.

Гэтая праца яшчэ раз патрабуе ўвагі з боку партыйных, камсамольскіх і грамадзкіх арганізацый.

У рэалізацыі 3-й пазыкі трэба скарыстаць школы, якія праз вучняў могуць павесьці працу па далейшаму прасоўваньню яе ў сялянскую масу. Гэта праца дасьць добры выпік, калі тут будзе ўжыта сацыялістычнае спаборніцтва паміж асобнымі вучнямі і школамі.

Ня менш посьпехаў можа даць і абход сялянскіх двароў для зьбіраньня падпіскі, бо наглядаецца шмат выпадкаў, калі пастановы сялянскіх сходаў аб падпісцы сельсаветамі і іх кантрагэнтамі ня выконваюцца.

Ня кепска ўцягнуць больш шырока ў працу ўсе віды каапэрацыйных арганізацый, наладзіць праверку працы нізавых камісій садзейнічаньня і г. д.

Пакуль што вельмі марудна праходзіць праца і па афармленьні падпіскі.

Камісіі садзейнічаньня рэалізацыі пазыкі як райённыя, так і сельскія пачалі зьмяншаць тэмп працы. Яны правялі падпіску, а за яе далейшым ходам ня сочаць.

Камісіям садзейнічаньня трэба зьвярнуць больш увагі на замацаваньне праробленай працы па распаўсюджваньні, каб аформіць пазыку.

У гэтай галіне не праяўляюць актыўнасьці і крэдытныя ўстановы.

Кепска таксама абстаіць справа з афармленьнем пазыкі і на райёнах. З агульнай распаўсюджанай сумы афармлена каля 50 проц.

Па асобных райёнах справа абстаіць яшчэ горш. Напрыклад, Чырвонапольскі райён аформіў усяго толькі каля 14 процантаў, Быхаўскі—каля 20 проц., а Кармянскі да гэтага часу нічога не зрабіў па афармленьні.

Трэба ажыць і такія моманты, калі грошы ад рабочых і служачых на ўзносы бярэцца, а адміністрацыя скарыстоўвае іх для звароту прадпрыемства і ўстановы карыстаецца імі па 10 і больш дзён.

Гэткія выпадкі былі ў друкарні „Саха і Молат", акрсельгассаюзе, спраўдоме і першай савецкай больніцы. Грошы імі былі ўнесены толькі тады, калі акрфінаддзелам быў складзены акт.

А-сь.

Фабрыкі і заводы недастаткова афармляюць падпіску.

Кантрольныя лічбы павінны быць выкананы.

Замацаваць і за сэзоньнікамі.

На дражджавым заводзе «Чырвоная Зорка» на 3 пазыку індустрыялізацыі падпісалася 193 рабочых на агульную суму 12800 р., што складае 91,5 проц. месячнага заробку. Падпіска на пазыку прашла дружна.

Зараз узьнікае замінка з тымі рабочымі, якія звальняюцца з працы. Такіх ёсьць 20 чал. Частка з іх пераводзіцца на інш. заводы, а таму падпісаная сума пазыкі застанецца за імі; тыя-ж рабочыя, якія ідуць на біржу працы, вызваляюцца ад падпіскі на пазыку. Праўда, такіх ёсьць мала, але гэта аднак, адбіваецца на зьмяншэньні падпіскі.

На заводзе „Беларусь" падпіска скарацілася на тысячу рублёў.

На заводзе „Беларусь" папярэдняя падпіска дала каля 7 тыс. р. Ніхто з падпісаўшыхся ня робіць спробы зьменшыць падпіску. Але скарачаюць 16 рабочых-сэзоньнікаў, з прычыны чаго сума зьменшыцца на тысячу рублёў.

Трэба ўжыць захады, каб вялася сталая праца па рэалізацыі падпіскі паміж сэзоннымі рабочымі. На нашу думку, такая праца пакуль што не вядзецца.

Завод „Бальшавік" павінен быць прыкладам.

Папярэдняя сума падпіскі на 3-ю пазыку індустрыялізацыі сярод рабочых гарбарні «Бальшавік» (Менск) складае каля 75 тыс. руб.

Падпіскай ахоплены 785 рабочых з агульнай колькасьці працуючых 800 чалавек.

Дзеля пашырэньня пазыкі паміж асобнымі цэхамі і групамі рабочых практыкаваліся спаборніцтвы-выклікі.

Характэрна адзначыць, што за апошні час некалькі аслабела ўвага да падпіскі. Фабком амаль нічога ня робіць, каб хутчэй аформіць падпісныя сумы і яшчэ больш пашырыць пазыку сярод асобных груп рабочых, якія недастаткова ахоплены падпіскай.

Чырвонаштандартны завод «Бальшавік» павінен быць прыкладам іншым прадпрыемствам у сэнсе выкананьня кантрольных лічбаў па падпісцы на 3-ю пазыку.

РАБОЧЫ.

Першыя ўзносы.

Падпіска на 3-ю пазыку сярод рабочых Менскай абутковай ф-кі складае каля 26 тысяч рублёў.

Першыя ўзносы рабочых за аблігацыі 3-й пазыкі складаюць звыш 6000 рублёў.

В.

Разгарнуць тэмп рэалізацыі.

Кампанія па рэалізацыі 3-й пазыкі індустрыялізацыі ў гарадох сярод арганізаванага насельніцтва набліжаецца да канца. Праўда, мы яшчэ не дасягнулі па гэтай пазыцы 100 проц. ахопу рабочых і служачых, але кантрольная лічба, згодна апошніх весткаў Наркамфіну, выкананa на 139,1 проц.

Таксама выканана агульнае заданьне па рэалізацыі пазыкі сярод неарганізаванага насельніцтва больш чым на 141 проц.

Горш абстаіць справа з рэалізацыяй пазыкі сярод сялянства. Апошняя дэкада па ўсёй БССР дала толькі 137400 руб. і да 10 кастрычніка агульная рэалізацыя пазыкі сярод сялянства дасягнула толькі 1045900 р., ці 69,7 проц. кантрольнай лічбы. Такім чынам, мы яшчэ да сёньняшняга дня рашучага пералому ў кампаніі па разьмяшчэньні пазыкі ня маем.

Чым-жа гэта тлумачыцца?

Шэраг фактаў сьведчыць аб тым, што сялянства мае вялікія матар'яльныя магчымасьці ўдзельнічаць у пазыцы. Зараз мы маем вельмі спрыяючыя ўмовы, каб разгарнуць кампанію па рэалізацыі пазыкі сярод сялянства: сяляне рэалізуюць ураджай і варочаюцца дамоў тыя з іх, што былі на працы ў летні час ў гарадох. Ня гледзячы на ўсе спрыяючыя ўмовы для разьмяшчэньня пазыкі, мы назіраем яшчэ зусім слабы тэмп у гэтай працы. Нашы мясцовыя грамадзкія арганізацыі і ў першую чаргу сельскія камісіі садзейнічаньня дзяржкрэдыту слаба разгарнулі растлумачальную працу. Ёсьць выпадкі, што ў некаторых райёнах і сельсаветах пераважная большасьць сялянства не набыла ніводнай аблігацыі. Напрыклад, у Дудзіцкім сельсавеце, Мазырскай акругі, з 800 гаспадарак ахоплена падпіскай на 3-ю пазыку індустрыялізацыі толькі 18 сялянскіх гаспадарак на 290 руб. Слаба праведзена падпіска па Калінкавіцкаму раёну і сярод калгасьнікаў.

Мазырскі акрвыканком адзначае таксама нездавальняючую працу па распаўсюджваньню пазыкі ў Каралінскім раёне. Каралінскі райвыканком слаба кіраваў кампаніяй, у выніку бязьдзейнічалі сельскія камісіі садзейнічаньня. Не праводзілася праца па ўтрыманьні пазык на руках і па здачы апошніх на захаваньне, у зьвязку з чым у Каралінскім раёне нават ніводзін адказны працаўнік ня здаў па захаваньне свае аблігацыі.

Прыведзеныя факты характэрны і для шмат якіх іншых раёнаў БССР. У многіх раёнах назіраецца няўменьне мясцовых працаўнікоў увязваць іншыя кампаніі ў вёсцы з кампаніяй па рэалізацыі пазыкі. Трэба паставіць справу так, каб працаўнікі, якія праводзяць хлебазагатоўчую і іншую палітычную кампанію, увязвалі сваю працу і з кампаніяй па рэалізацыі пазыкі.

Кампанія па рэалізацыі пазыкі ў вёсцы ўступае ў самы цяжкі і адказны этап. Зараз неабходна ахапіць пазыкай усе сялянскія гаспадаркі, бо толькі пры гэтых умовах будзе выкананa кантрольная лічба, якая прыпадае на вёску.

Трэба прыняць усе меры, напружыць усе сілы, каб шырэй разгарнуць растлумачальную працу ў вёсцы; камісіі садзейнічаньня пры сельсаветах павінны прыцягнуць да папулярызацыі і распаўсюджваньня пазыкі увесь вясковы актыў. Нельга абмяжоўвацца толькі абгаварэньнем пытаньня пазыкі на агульных сходах, а трэба наведваць сялян па хатах, праводзіць з імі гутаркі і ўцягваць у рэалізацыю пазыкі.

Па Беларускай ССР

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Кулакі тэрарызуюць беднату.

Гомель, 16-X. У апошні час кулакі абнаглелі. Яны адкрыта процідзейнічаюць хлебазагатоўкам. У вёсках Камарынскага раёну кулакі тэрарызуюць беднату і грамадзкіх працаўнікоў вёскі.

У сяле Калыбань кулакі падпалілі гаспадарку старшыні спажывецкага таварыства і зрабілі замах на яго жыцьцё. У другіх населішчах кулакі пагрозамі прымусілі сялян не здаваць каапэрацыі хлебныя лішкі.

Самым распаўсюджаным мэтадам зрыву хлебазагатовак зьяўляецца распаўсюджваньне хлусьлівых чутак. Яны імкнуцца пераканаць серадняка, што ня трэба здаваць дзяржаве хлебныя лішкі і плаціць падаткі. У Церахоўскім райёне кулакі распаўсюдзілі чуткі пра тое, што Кіеў ужо заняты ворагам.

Адгэтуль слабы тэмп хлебазагатовак. Кіруючыя працаўнікі райёнаў яшчэ да гэтага часу адносяцца да загатовак нядбайна і ўсю працу звальваюць на працаўнікоў, якія прысылаюцца з гораду ў падмогу ім. У выніку такіх адносін да гэтай важнейшай кампаніі мы маем яшчэ населішчы, дзе да гэтага часу хлебазагатоўкі не пачаліся. Саюзныя органы ня могуць пахваліцца сваім удзелам, члены саюзаў, якія працуюць у гарадох і жывуць у вёсцы, не зьяўляюцца прыкладам. Большасьць членаў слюзаў ня ўдзельнічаюць у здачы чырвонымі абозамі хлебных прадуктаў. Зразумела, такія „рабочыя" павінны быць занесены на чорныя дошкі. Яны, як і кулакі, зрываюць хлебазагатоўкі.

Толькі бядняцка-сераднякае сялянства здае свой хлеб. На 10 кастрычніка ўжо здадзена больш 2000 тон хлеба, што складае 32,5 проц. гадавога пляну. Паасобныя населішчы Чачэрскага і Буда-Кашалеўскага райёнаў поўнасьцю выканалі свае гадавыя пляны. У хвасьце плятуцца Брагінскі, Камарынскі, Хойніцкі і Лоеўскі райёны.

Замах на забойства актывіста.

(Магілеўшчына).

Гэтымі днямі падкулачнік Землянкоў Яника з вёскі Паўлаўка, Хоцімскага раёну, стрэлам з вінтоўкі хацеў забіць аднавяскоўца Гаўрыленка.

Гаўрыленка — бядняк-актывіст, сябра калгасу. Падкулачнік помсьціў Гаўрыленку за працу па арганізацыі калгасу.

Па справе, апроч Землянкова, затрыманы чатыры кулакі з Паўлаўкі.

Л-ны.

Здамо лішкі збожжа каапэрацыі.

(Копыскі р-н, Арш. акр.).

Беднота в. Ст. Стайкі пастанавіла здаць каапэрацыі лішні збожжа (214 пуд.) і выклікаюць суседнія вёскі зрабіць па іх прыкладу.

Беднота хут. Прэнцоўка, ня гледзячы на частковыя вымачкі жыта, адгукнулася на заклік і пастанавіла калектыўна здаць каапэрацыі 122 пуды рознага збожжа.

Гр-не в. Нікіцінічы ў колькасьці 150 двароў пастанавілі здаць каапэрацыі 915 п.

М. Гурэвіч.

У хлебазагатоўках ёсьць пералом.

МАГІЛЕЎ, 16-X. Хлебазагатоўкі на Магілеўшчыне маюць значны пералом, але практыка самацёку яшчэ ня зьнішчана. Яшчэ і на сёньняшні дзень паступаюць весткі з месц, што пытаньне хлебазагатовак у шырокіх колах сялянства не папулярызавана.

Але, ня гледзячы на гэта, у хлебазагатоўках заўважваецца значны зрух; аб гэтым сьведчаць наступныя лічбы:

На сельска-гаспадарчай каапэрацыі ў жніўні было значнае невыкананьне пляну месячнага заданьня, верасень дае значны зрух. Верасьнёўскі плян па сельгаскаапэрацыі па жыту выкананa на 160 проц. сярод сялян па калгасах на 103 проц. па ільна насеньню на 210 проц.

Па асобных таварыствах: Быхаўскае мела заданьне загатовіць 16 тон, загатоўлена 31 тона, Сухараўскае заданьне 4,4 тоны, загатоўлена—10,6 тоны і інш.

Але разам з гэтым ёсьць і такія таварыствы, якія значна адстаюць—гэта Чарнаруцкае, Галоўчынскае, Фашчаўскае і інш.—якія выканалі ня больш 50 проц. заданьня.

Па спажывецкай каапэрацыі верасьнёўскі плян выканан: па жыту—на 198 проц., па яравых—на 99 проц.

Самае балючае ў хлебазагатоўках тое, што па ўсіх загатоўчых органах няма належнай колькасьці складаў.

Кепска таксама абстаіць справа і з прысылкай раёнамі вестак. Паступаюць яны ў большасьці са спазьненьнем на 8-10 дзён, а ёсьць і такія нізоўкі, якія з прысылкай вестак проста праляўляюць злачынства.

А—сь.

Перад новымі выбарамі ў Чэха-Славакіі.

27 кастрычніка адбудуцца новыя выбары ў чэха-славацкі парлямант. Камуністычная партыя Чэха-Славакіі ў гэты момант павінна ў поўнай меры ўдасьніць сабе гістарычны сэнс сучаснай выбарчай барацьбы і ў сувязі з гэтым сфармуляваць свае задачы ня толькі адносна самых выбараў, але і адносна ўсёй рэвалюцыйнай палітыкі цалкам.

Разьвіцьцё імпэрыялістычных тэндэнцый Чэха-Славакіі працякала за апошнія гады на падставе найвялікшага пашырэньня манапалістычнага капіталізму. Бяз усякага пераўвялічэньня можна сказаць, што Чэха-Славакія належыць да ліку тых краін, у якіх манапалістычны капітал дасягнуў вышэйшай ступені свайго разьвіцьця. Фінансавая магутнасьць краіны згуртавана ў надзвычайна нязначнай колькасьці буйных банкаў, якія ўстанавілі паміж сабой за апошнія гады самыя разнастойныя формы сувязі. Уся буйная прамысловасьць цалкам зьвязана з гэтымі банкамі. Гэткім чынам, у Чэха-Славакіі можна гаварыць аб абсалютным панаваньні фінансавага капіталу.

Рост манапалістычнага капіталу ў сувязі з барацьбой за рынкі збыту ўтварае такія супярэчнасьці, з якімі чэха-славацкі імпэрыялізм ужо ня мае магчымасьці справіцца. У пагоні за рынкамі збыту чэха-славацкі імпэрыялізм павінен пязьбежна адставаць у параўнаньні з больш моцнымі імпэрыялістычнымі канкурэнтамі, ня гледзячы на тое, што ў некаторых галінах (вайсковая прамысловасьць і г. д.) ён дабіўся поўных посьпехаў.

Расхіставьне капіталістычнай стабілізацыі ў выніку яўнага пагоршаньня кан'юнктуры, лютая барацьба за рынкі збыту, патрэбнасьць новай хвалі капіталістычнай рацыяналізацыі і, нарэшце, узрастаючае імкненьне чэха-славацкай буржуазіі канчаткова скалаціць антысавецкі фронт—вызначаюць гістарычны сэнс новых выбараў у парлямант. Непасрэдным повадам для правядзеньня перавыбараў зьявіўся ўрадавы крызіс. Сапраўдная мэта іх заключаецца ў паскораньні канцэнтрацыі фашысцкіх сіл пад кіраўніцтвам групы Масарыка, што ўжо ў працягу пэрагу год зьяўляецца лейт-матывам чэха-славацкай палітыкі.

Фашызацыя Чэха-Славакіі за апошнія гады была аснована на непасрэдным удзеле ва ўрадзе палітычна-рашаючых партый нацыянальных меншасьцяў. Фашысцкі курс ужо ў сучасны момант мае моцную апору ў нямецкай і славацкай буржуазіі. На гэтым канцэнтрацыя фашысцкіх сіл яшчэ ня скончана. Перад чэха-славацкай буржуазіяй паўстае пытаньне аб прыцягненьні да ўдзелу ва ўрадзе сацыял-фашысцкіх партый. І ў гэтым напрамку таксама можа Масарык узяць на сабе кіраўніцтва чэха-славацкай буржуазіяй, паколькі ён ідэалёгічна, і ў асаблівасьці, практычнай палітыкай цесна зьвязан з сацыял-фашысцкімі партыямі.

Разьвіцьцё чэха-славацкай сацыял-дэмакратыі ў бок адкрытага сацыял-фашызму ўжо зайшло вельмі далёка. Ідэалёгія «прамысловага міру» ужо даўно прывяла гэту партыю на шлях адкрытага штрэйкбрэхэрства. «Прамысловы мір» рэлірэцца ў форме адкрытага супрацоўніцтва з чэха-славацкай сацыял-дэмакратыяй у правядзеньні капіталістычнай рацыяналізацыі. Праграма „аб'яднаньня чэха-славацкіх прамысловцаў" стала таксама праграмай чэха-славацкага сацыял-фашызму. Эканамічная праграма Ходача сустрэла ў рэфармісцкім друку неабмежаванае адабрэньне. Чэха-славацкі сацыял-фашызм за гэтыя 3½ г., у працягу якіх рэфармісты ня прымалі непасрэднага ўдзелу ва ўрадзе, дасягнуў поўнага росквіту і ўпаўне прыгодны да таго, каб правесьці фашысцкую праграму буржуазіі ў якасьці ўрадавай партыі. Сучасныя гаспадарчыя цяжкасьці ўтвараюць глебу для больш моцнай змычкі сацыял-фашызму з фашысцкай канцэнтрацыяй.

Выбарчая адозва камуністычнай партыі з поўнай яскравасьцю ўстанаўлівае гэтыя пэрспэктывы выбараў.

„Буржуазная кааліцыя ў сучасны момант ліквідуецца ў першую чаргу для таго, каб прыцягнуць сацыял-фашыстаў да непасрэднага правядзеньня далейшых плянаў фінансавага капіталу па правядзеньні эксплёатацыі, фашызацыі і вайны.

Няхай ніхто ня дасьць ашукаць сябе „апазыцыямі" крыкамі сацыял-фашыстаў і ўзаемнымі нападкамі ранейшых кааліцыйных партый. Гэта проста тая заслона за якой адбываецца канцэнтрацыя фашысцкіх і сацыял-фашысцкіх сіл буржуазіі ўсіх нацыянальнасьцяў".

Выбарчая адозва камуністычнай партыі выразна і недвусэнсова адказвае таксама на пытаньне аб палітычным сэнсе сучасных перавыбараў у парлямант. Аналіз камуністычнай партыі цалкам пацьвярджаецца выбарчай адозвай, з якой чэха-славацкія сацыял-дэмакраты выступілі перад рабочымі масамі. Гэта адозва канчаецца наступнымі словамі: „Дапамажэце сацыял-дэмакратыі завалваць такую долю ўлады, каб яна ад імя ўсяго працоўнага насельніцтва і ў якасьці яго прадстаўніка магла садзейнічаць стварэньню новай урадавай сыстэмы, якая ператворыцца ў апору рэспублікі працоўных мас, сапраўднай дэмакратыі і здаровага прагрэсу".

Мы маем перад сабой, як відаць, сапраўды надзвычайна выразны прагрэс у бок сацыял-фашызму. Выбарчая адозва чэскіх сацыял-дэмакратаў характарызуецца яшчэ і тым, што яна абмінае поўным маўчаньнем пралетарскія баявыя патрабаваньні. Цэнтральным пунктам праграмы зьяўляюцца эканамічныя патрабаваньні, якія выпускаюцца пад загалоўкам: «Рабочая праграма сацыял-дэмакратыі на бліжэйшы пэрыяд».

Пазбаўленьне рабочых свабоды дзеяньня пры дапамозе сыстэмы прымірэнча-трацейскага разгляду працоўных канфліктаў, давядзеньне беспрацоўных да голаду пры дапамозе страхаваньня ад беспрацоўя,—гэткая сацыял-палітычная ўрадавая праграма.

Бліскуче дасягненьне сацыяльнай дэмагогіі выяўляюць сабой патрабаваньні перамогі крызісу ў сельскай гаспадарцы. Гэты разьдзел пачынаецца наступным чынам: «Што датычыцца сельска-гаспадарчага крызісу, дык мы патрабуем перагляду мытнага тарыфу, каб сельская гаспадарка па самых танных цэнах атрымлівала ўсё тое, што патрэбна для вытворчасьці і тэхнічнага прагрэсу».

Тэхнічны прагрэс, г. зн. правядзеньне капіталістычнай рацыяналізацыі ў сельскай гаспадарцы зьяўляецца першым і апошнім словам гэтай сацыял-дэмакратычнай праграмы: сапраўдныя зьдзекамі над масамі сялянства, зямельны голад, бакі ў самай меншай меры ня быў здаволен чэха-славацкай зямельнай рэформай, гучаць патрабаваньні ў галіне зямельнага пытаньня. Яны абмяжоўваюцца наступным:

1. Занясеньне ў зямельныя кнігі зямельных прырэзкаў.

2. Урэгуляваньне прававых адносін зямельных уласьнікаў.

Сацыял-дэмакратыя становіцца, гэткім чынам, без астатку, на глебу рэакцыйнай зямельнай рэформы. Мала таго, яна патрабуе нават юрыдычнага замацаваньня выпікаў гэтых контррэвалюцыйных учынкаў чэха-славацкай аграрнай буржуазіі. Гэткая праграма чэскіх сацыял-дэмакратаў.

У цэнтры сучаснай выбарчай барацьбы стаіць, значыцца, урадавая праграма чэха-славацкага сацыял-фашызму. Ажыцьцяўленьне гэтай урадавай праграмы, якая пабудавана на прынцыпе сацыяльнай дэмагогіі, у сучасны момант зьяўляецца канкрэтным шляхам разьвіцьця лягеру фашысцкай канцэнтрацыі ў Чэха-Славакіі. У гэтай сітуацыі перад камуністычнай партыяй стаяць вялізарныя задачы. У той час, калі сацыял-фашызм робіцца адным з важнейшых рычагоў працэсу фашызацыі, выключаныя з шэрагаў камуністычнай партыі ліквідатары імкнуцца ўнесьці блытаніну ў масы рабочых па важнейшых асноўных пытаньнях урадавай палітыкі і затрымаць мабілізацыю рабочых мас супроць сацыял-фашызму. Камуністычная партыя здолее ў часе гэтых выбараў выканаць сваю галоўную задачу—барацьбы супроць фашысцкай канцэнтрацыі сіл і яе сацыял-фашысцкіх агентаў толькі пры ўмове, калі яна ў гэтай выбарчай барацьбе зусім разаб'е і ліквідатарскіх саюзьнікаў сацыял-фашызму. У гэтай адносіне выбарчая барацьба павінна стаць грунтам далейшай кансалідацыі рэвалюцыйных сіл у Чэха-Славакіі.

Камуністычная партыя ўступае ў гэту барацьбу пры спрыяючых умовах паколькі працэс фашызацыі і новыя рацыяналізатарскія мерапрыёмствы прадпрыёмцаў у вялізарнай меры паскорылі палявеньне рабочых мас.

Выходзячы з факту палявеньня працоўных мас, камуністычная партыя павінна пры дапамозе новых баявых мэтадаў і новых форм барацьбы, шляхам узмацненьня пралетарскага адзінага фронту зьнізу, барацьбы супроць фашызму паглыбіць масавую мабілізацыю працоўных і надаць гэтым выбарам выразны характар „антыфашысцкіх выбараў". Галоўны ўдар яна павінна накіраваць супроць сацыял-фашызму, які выкрывае сябе зараз поўнасьцю ў вачох шырокіх працоўных мас. Адначасова партыя павінна выкарыстаць глыбокі с.-гасп. крызіс для таго, каб мабілізаваць бядняцкія сялянскія масы супроць аграрнай буржуазіі і выразна і яскрава фармуляваць свае патрабаваньні для бядняцкіх сялянскіх мас, утварыць адзінны рэвалюцыйны фронт проці сацыял-фашыстаў, якія выступаюць з патраба

Літаратура — Мастацтва — Крытыка

ЮЛІ ТАУБІН.

ТРАМВАЙ

У спаборніцтве людзі і дні—
Дні шалёнае творчае гонні...
Разганяюць трамваяў агні
Цэмру дзён дапатопнае конні.
Упрыгожаным колерам край
Ліхтары залатыя ўтуляць.
Праплывае масноўскі трамвай
Па выбоінах Менскіх вуліц.

Гэта Менск, гэта „западный" Менск,
Ён адкінуў былую жалобу.
І насустрач трамваю ля сцен
Шле вітаньне калега-аўтобус.
І яшчэ прывітальны паклон
Ад далёкіх і блізкіх паволіц:
Гэта—поліч фабрычных гудкоў,
Гэта—шумы калегаснага поля.

* * *

Трамвай праплывае
далей і далей,
Блішчаць яго алыя латы.
З усьмешнай прывітай
мільгае ў вакне
Трамвайны вагонаважаты.
Трамвай праплывае!
Гады перамог,
Гады капітальных рамонтаў!
Зьнікаюць у днёх
будаўнічых трывог
Часы дапатопнае конні.
Мы горад узьнімем
паверхамі ў высь.
Адзенем дарогі асфальтам
Да сьветлага імя
„Сацыялізм"
Нясуць нас часоў нашых шальты.
І кожны наш дзень—
гэта новы вагон—
Нясе нас у гэткія шыры,
Дзе ўсё напярэдадні сонечных дзён
— Важатыя і пасажыры.
А горад ня ціхне...
Узбуджаны шум
Цудоўныя песьні сьпявае.
І весь праплыла
цераз гоман і тлум
Павеўная постаць трамваю.
Гады дзіваваньняў!
Гады перамог!
Гады капітальных рамонтаў!
У асфальт убіраем праспцагі дарог,
Зьмялі дапатопную конку.
І сэрца калоціцца,
б'ецца за край,
І хочацца крыкнуць заўзята:
„Вядзі-жа ўпэўнена
першы трамвай,
Таварыш-вагонважаты"!

Менск,
13-X-1929 г.

Узвышэнская паэзія.

(Пастаноўка пытаньня).

Ein unütz Leben
ist ein früher Tod.
Goethe.

Пытаньні паэзіі зараз набываюць асаблівую значнасьць таму, што творчы шлях паасобных паэтаў, якія некалі ішлі на чале раваляцыйнай паэзіі, звужаецца да шіга-суб'ектыўных, часам відавочна рэакцыйных, хісткіх ідэалёгічна твораў.

І гэта зразумела, бо абвостраная клясавая дыферэнцыяцыя насельніцтва расчыняе сапраўдны твар тых ці іншых пісьменьнікаў, якія хоць і адзначаюць, што

„Усе, усе мы носім маскі,
Нат скінуць дома баімося",

але гэтыя маскі спаўзаюць і агаляюць грымасу—ці адчаю бяссільля, ці гіроніі да сучаснасьці, ці рашучасьці контратакі на посьбітаў пралетарскай культуры, што аднакава небясьпечна, што аднакава шкодзіць ідэям пралетарскай рэвалюцыі.

Заўжды трэба памятаць формулу Г. В. Плеханава: „Воспроизводя жизнь в созданиях искусства, люди воспитывают себя для своей общественной жизни, приспосабливают себя к ней". (Том V, ст. 316).

Зразумела адсюль, што кожны пісьменьнік, выказваючы погляды, якія адпавядаюць сваёй групоўцы ці клясе займаецца „воспитанием себя" для жыцьця менавіта ў той грамадзкай катэгорыі, прадуктам якой ён зьяўляецца. Гэта таму, што пісьменьнік вьязаны з сваім асяродзьдзем політычнай і матар'яльнай «пупавінай», праз якую ён спажывае факты для сваёй творчасьці.

Я хачу ілюстраваць свае тэзісы прыкладамі паэтычнай прадукцыі часопісі „Узвышша" за апошні год, агулам, творчасьцю Язэпа Пушчы, прыватна.

Чаму пра „Узвышша" і Пушчу? А таму, што „Узвышэнскі" паэтычны фронт робіць адмоўны ўплыў у адносінах да паэтычнага маладняка, які часта бяз жаднай крытыкі „вучыцца" ў гэтых паэтаў. І вучоба гэта заходзіць дужа іншы час далёка: координата яе ня толькі фармальнага парадку, але і ідэёвага. Гэта ў аднолькавай ступені небясьпечна, бо нельга-ж матыў „хаўтурны", прыкладам, класьці ў напеў „лявоніхі", бо ідэалёгічны эквівалент творчасьці афарбоўвае форму твору адпавядаючымі зьместу канструкцыйнымі рысамі.

Старая канцэпцыя аб «разрыве» формы і зьместу аджыла свой век, бо «в художественном произведении посредством образов (і стылю—Б. М.) всегда даны общественная идеология и психология (помыслы и чувства) того класса, представителем которого художник является» (А. Камегулов). Пануючым поглядам на паэзію Язэпа Пушчы «ўзвышэнскага» кругабегу зьяўляецца тое, што яго творчасьць адпатоўвае кулацкую вёску, веску, якая адыходзіць, ідэалізуючы яе. Асабліва цікава праглядзець вершы Пушчы за гэты, 1929 год, якія зьявіліся пасьля таго, як слушна раскрытыкавалі яго «сабачыя лісты», каб вырашыць пытаньне пра яго далейшы творчы шлях.

Пушча далёка не займаецца „беспрадметнай" лірыкай. Сказаць адвароткае—будзе памылкай.

Кожны радок яго паэзіі—кандэнсаваны вобраз і водгалас ідэалёгічных вібрацый.

Пушча—разумны чалавек. Ён адчувае, што яго „смутак", маючы глыбокія сацыяльныя карэньні, тхне ў сучаснасьці рэакцыйна. У яго хапае гіроніі, каб сказаць пра сябе і «прысных».

„Там недзе абшчыпаны жораў
Схіліўся над смуткам маім".
(Узвышша, 2, 1929 г.).

Ён адчувае, што „старая казэ" сёньня ўжо не патрэбна, але не хапае сілы ў яго (ці ён ня хоча?) адмовіцца ад яе:

„Яна („старая казэ"—Б. М.) і сягоньня мадона,—
Ёй радась, і песьні, і сьмех".

Таму і прыходзіць да бязумоўна адмоўнага фіналу:

„Паэты, ваш месяц мядовы
Прысьніцца вам толькі у сьне".

Пушча глыбока ўрбаністычны, у яго заўсёды калізія, улясьцівая крайне рэакцыйным „сиянствующим" паэтам: „Над горадам сьвеціць маяк, над поплавам вырай буслоў".

А разам з урбанізмам, як выніх крайнасьці яго, на Пушчавых вершах ляжыць моцны адлюстровак рамантызму. Але рамантызму шкоднага, які прымушае азірацца паэта на старое, аджыўшае. І гэтае старое, варожае сучаснасьці ўзводзіцца ў фэтыш,—паэта схіляе перад архаічнасьцю вёскі галаў.

Мне ня хочацца даваць багата цытат. Прачытайце другі разьдзел „Сьнежаньскай сьвежасьці" (Узвышша, 1, 1929 г.) і вы ўбачыце, як малюе там Пушча, на нашу думку, свой паэтычны шлях. Інакш, я мысьлю, нельга зразумець гэтага твору. Паэта ня бачыць выразных зрухаў вёскі. Яна яму малюецца дужа проста:

„Вось і крыж усё той самы,
Нават з тым-жа і хрыстом—
Не сьпяваюць толькі псальмаў
У заветную сутонь".

Вы разумееце: „У заветную сутонь"! Які чуецца ў гэтым адчай! І адчай гэты павялічваецца, калі Пушча ў «Радасным дзікуне» (?!) дае такі малюнак:

„Мастак з граніту крыж той высеў
І на крымы сябе расьпяў".

Проста цудоўна! Але бяда тая, што такія „пакутнікі" толькі псуюць справу, толькі перашкаджаюць на шляху гэроікі нашых дзён, бо гэраізм працоўных у «сто крат» больш дае спажыўнага матар'ялу для песьняра.

Калі мы кажам, што паэта павінен быць змагаром, у руках якога дужа моцнае аружжа—слова, дык Пушча расьпінае сябе на крыжы і тэатральна крычыць:

„Хто хоча, радуйся, хто сьмейся,
Імя расьпятаму—хрыстос".
(Узвышша, 6, 1929 г.).

Не расьпінайце сябе! Не малеціся заімшэламу хрысту! Ня шукайце „вбавеньня апроч некнаты" ў „музэйнай мярцьвячыне!

Памятайце гэніяльныя словы Вольфганга Гётэ: „Ein unütz Leben ist ein früher Tod"!

Вашы творы, за якімі выплывае „мурло" мешчаніна, кулака, гандляра, не патрэбны працоўнай грамадзе, як і не патрэбны ёй і водгаласы „бодаўшчыны" вашых ідэалёгаў.

Памятайце словы Блока: „Всей душой слушайте музыку революции!" Вучэцеся на яго творчым прыкладзе, як цяжка адчуваць нікчэмнасьць свайго становішча бяздомнай зязюлі.

Памятайце нікчэмнасьць цьвілога патасу скіравацъ старно пралетарскай літаратуры ў бок шкодных ухілаў пад вэлюмам «містыкі».

Ідзе літаратурны маладняк. Ён хоча вучыцца ў паэтаў. Ён мо' і захапляецца «суворай чэкавкай» вашай паэзіі. Але ён не заплюшчыў вочы на акаляючае, ён зразумее Пушчаўскі надцін і пойдзе супроць яго вайной пад сьцягам БелАПП.

Я ўзяў вершы Язэпа Пушчы сьвядома. Яго палітычна-творчы шлях уяўляе, вядома, дужа крывы графік. Я маю сьмеласьць сказаць, што, аналізуючы вершы Жылкі, Кляшторнага і Лужаніна, заўважваюцца гэткія-ж адхіленьні. Досыць успомніць „Калі асядае муць" Кляшторнага, „Мініатуры" Лужаніна і г. д.

Яшчэ мала дасьледавана пытаньне: ці зьяўляецца форма «Узвышэнскай» паэзіі спрыяючай для сучаснай паэзіі? Ёсьць шмат графаманаў, якія працягваюць сьпяваць оды нібыта бяспрэчнай фармальнай вертасьці „узвышэнскай" пісаніны. Сочучы тклiва за кожным нумарам «Узвышша», прыходзім да поўнага выніку: стылістычна і канструкцыйна творчасьць Пушчы, Кляшторнага і К-о уяўляе застылую груду архаічнасьці, якая адпавядае агульнай існасьці тэматыкі іх.

Барыс Мікуліч.

МАСТАЦКАЕ СЛОВА—МАСАМ.

Гэтымі днямі Белдзяржвыдавецтва выпускае ў сьвет першыя кніжкі таннай масавай бэлетрыстыкі. Сэрыя „Мастацкае слова—масам" складаецца з арыгінальнай белпрозы і паэзіі, а таксама з перакладаў лепшых сучасных твораў расійскіх і украінскіх пісьменьнікаў.

Якія прынцыпы ўзяты ў аснову гэтай працы? Якімі мэтамі кіравалася выдавецтва, рыхтуючы масавую мастацкую сэрыю?

Сягоньня, калі сацыялістычнае будаўніцтва ідзе шырокім разгорнутым фронтам, калі мільённыя масы актыўна ўдзельнічаюць у гэтым будаўніцтве, трэба і мастацкае слова далучыць да гэтай гіганцкай працы. Кожная савецкая кніга, а ў тым ліку і кніга прыгожага пісьменства, павінна быць надпарадкавана мэтам і практычным заданьням сацыялістычнага будаўніцтва. Масавая мастацкая кніга павінна дапамагчы масаваму чытачу ўсьвядоміць і адчуць усю веліч, усю грандыёзнасьць гістарычных зрухаў, якія адбываюцца на нашых вачох. Масавая кніга павінна падтрымліваць бадзёры настрой, загартоўваць волю для ўпартае працы і змаганьня, выхоўваць веру ў канчатковую перамогу сацыялізму ў нашай краіне і ва ўсім сьвеце. Масавая мастацкая кніга—гэта набат, які будзіць сьвядомасьць міліёнаў, гэта настаўнік, які выхоўвае у масах імкненьне да самаадукацыі, гэта агітатар-прапагандыст, які ўводзіць міліённую аўдыторыю ў кругабег грамадзкіх і палітычных падзей і найпрыметкі робіць сваіх слухачоў больш палітычна сьвядомымі і актыўнымі. Масавая мастацкая кніга—вялікая сіла якую трэба ўсямерна выкарыстаць для культурнага, грамадзкага і палітычнага выхаваньня мас.

Каб зрабіць сваю вялікую справу, масавая мастацкая кніга мусіць адпавядаць пэўным вымаганьням.

Папершае, яна павінна дайсьці да масавага чытача, г. зн. быць максымальна таннай. Падругое, па свайму зьместу, па форме і выкладаньню масавая кніга павінна быць даступна самым шырокім масам. У масавай кнізе павінна быць тэма, якая цікавіць масу—клясавае змаганьне ў мінулым і сучасным, змаганьне за новыя формы быту, змаганьне з цэмрай, рэлігіяй, эксплёатацыяй, удзел рабочых і сялян у сацыялістычным будаўніцтве, посьпехі і пэрспэктывы гэтага будаўніцтва.

Выпуск масавай мастацкай літаратуры ёсьць справа адказная і ў нашых беларускіх умовах зусім новая. Тут мы ня маем аніякага папярэдняга вопыту, няма на чым павучыцца, пра верыць. Але гэта ня значыць, што мы маем права рабіць памылкі і пасьля на гэтых памылках вучыцца. Выдаваць масавую літаратуру трэба так, каб яе асартымэнт складаўся з кніжок, бясспрэчных па сваёй ідэалёгічнай вытрымванасьці. Форма і выкладаньне ў масавай кніжцы павінны быць разьлічаны на непадрыхтаванага чытача, на добра пісьменнага рабочага і селяніна.

У кожнай кніжцы трэба даць кароценькую біаграфію пісьменьніка, з пералічэньнем іншых яго твораў, растлумачыць асноўную ідэю данага твору. У канцы кніжкі зьмясьціць апытальнік для таго, каб чытач мог напісаць у выдавецтва свае думкі наконт гэтае кніжкі.

Гэта дасьць магчымасьць пачаць вывучэньне масавага чытача.

Якія-ж творы дасьць выдавецтва ў масавай сэрыі?

У першую чаргу—творы беларускіх празаікаў, пераважна сучасныя творы малодых пралетарскіх пісьменьнікаў. Пасьля творы расійскіх і украінскіх пралетарскіх празаікаў. Далей—лепшыя творы беларускіх клясыкаў і паэзію.

З расійскіх пісьменьнікоў будуць выданы творы Лебедзінскага, Серафімовіча А., Фурманава, Фадзеева, Логінава-Лесьняка, Гладкова, Лугіна, Горкага М., Пад'ячава.

З беларускіх аўтараў зараз зданы ў друк: «Вецер з Усходу»—Ліманоўскага, „Гой" і „Апошні зьверыядавец"—Лынькова, „Вінчэсцер" і інш. —Мурашкі, «Салавей» (скарочаны)—Бядулі, «Ічэ»—Янара.

Памер масавых кніжак будзе пераважна ад 3 да 5 аркушаў, тыраж—ня меней дзесяці тысяч экземпляроў. Для патаненьня гэтых кніжок будзе скарыстаны спэцыяльны фонд. Тут-жа мы лічым сваім абавязкам адзначыць, што беларускія пісьменьнікі, каб зрабіць кніжкі яшчэ больш таннымі, адмовіліся ад значнай часткі свайго ганарару за творы, якія пойдуць у сэрыі «Мастацкае слова—масам».

Ів. Цвікевіч.

Паштовая скрынка.

Вярбе.— У вершах „Старажом майго юнацтва", „Дзе доленька мая" і „О, юнацкія годы"—бурлівая радасьць—вашы асабістыя перажываньні, мала цікавыя для грамады. Наогул, вершы вашсаны слаба і да друку не падыходзяць.

Я. Ермаловічу.—Верш „Пад зоны жыцьця" пераслалі ў БелАПП.

С. Астрэйку.—Верш „Рабінавы пажар" друкаваць ня будзем, у Ім непатрэбны „горкі сум".

К. Кароль.—Верш „Думкі кулака" накіравалі ў газэту „Беларуская Вёска".

За сыстэматычную, упартую антырэлігійную працу!

Працоўныя Смалявіцкага раёну скасавалі рэлігійныя забабоны, замяніўшы іх сьвятам ураджаю і калектывізацыі

Антырэлігійная праца ў калгасах Аршаншчыны не разгорнута.

Полацкія бязбожнікі праспалі асеньнія рэлігійныя сьвяты.

„Суднага дня" і „пакравоў" не сьвяткавалі.

(Смалявіцкі раён, Менскай акругі).

У „судны дзень" жыцьцё ў яўрэйскім калгасе „Новае жыцьцё" (Смалявіцкі раён Менскай акругі) ішло сваім звычайным нармальным тэмпам.

Работа ня спынялася. У «судны дзень» маладыя калектывісты калгасу „Новае жыцьцё" былі заняты прыёмкаю бульбы ад мясцовых сялян для свайго крахмальнага заводу, сартыроўкай яблык і іншымі работамі па сваёй гаспадарцы.

Толькі шасьць членаў калектыву—старыя дзяды і бабы—у гэты дзень не працавалі, аддаўшыся старым, ужо даўно аджыўшым свой век традыцыям. Але на іх мала хто зварочваў увагу.

У дзень „пакравоў" амаль што ўся вакольная сялянская беднота таксама працавала. Яны вазілі ў калгас прадаваць для крахмальнага заводу ліпкі сваёй бульбы, выконвалі і іншыя работы па гаспадарцы. Наогул-жа большасьць сялян правяла гэты дзень на с.-г. выстаўках, прысьвечаных сьвяту ўраджаю і калектывізацыі.

Да дню калектывізацыі калгасы Смалявіцкага раёну могуць пахваліцца вельмі значнымі дасягненьнямі. Напрыклад, на асушаных калгасам „Новае жыцьцё" балотах сёлета была пасаджана капуста, буракі, пасеен авёс і кармавыя травы. Усё гэта дало калгасу добры ўраджай.

Апроч таго чатыры мясцовых калгасы—„Новае жыцьцё", „Добрая воля" і два іншых аб'ядналіся і ўзялі на сябе ад Менсельпраму экспляатацыю крахмальнага заводу „Алесіна".

Але поруч з гэтымі дасягненьнямі, у калгасе „Новае жыцьцё" ёсьць і значныя хібы.

Напрыклад, калгас «Новае жыцьцё» перайшоў на грамадзкае харчаваньне. Гэта вельмі добрая справа. Але гэта грамадзкае харчаваньне пастаўлена там так дрэнна, што большасьці калектывістаў прыходзіцца ўсё роўна харчавацца ў сябе дома.

Вельмі актыўна, вельмі жвава прайшло сьвята дню калектывізацыі ў **Верхменскім сельсавеце**, Смалявіцкага раёну.

У вёсцы Верхмень у нядзелю 13 кастрычніка было арганізавана вялікае сьвята, на якое сабраліся ня толькі сяляне сяла Верхмень, але і з іншых суседніх вёсак, калгасьнікі, батракі і батрачкі з суседняга савгасу Шыпяны.

Рабочыя-будаўнікі, якія шэфствуюць над гэтым сельсаветам, выступілі з дакладам аб значэньні дню калектывізацыі і аб нашых задачах на фронце калектывізацыі сельскай гаспадаркі.

Пасьля дакладу быў наладжан вечар самадзейнасьці, скокі, гульні.

У мястэчку Смалявічы была адчынена ў гэтыя дні вялікая сельска-гаспадарчая выстаўка, на якой было паказана шмат цікавых сельска-гаспадарчых экспанатаў ад калгасаў, савгасаў і паасобных сялян.

Такім чынам без багоў абыйшліся і сёлета працоўныя Смалявіцкага раёну.

Яны не сьвяткавалі сёлета ні „суднага дню", ні «пакровaў».

А замест гэтых рэлігійных сьвят яны сьвяткавалі дзень калектывізацыі і ўраджаю—сьвята, якое заклікае нашу вёску да іншага, сацыялістычнага жыцьця.

Н. Б.

ЧЛЕН САЮЗУ СЛУЖЫЦЬ РЭЛІГІІ

(М. Ляды, Аршанскай акругі).

На адным сходзе стаіць пытаньне аб зачыненьні сінагогі, якіх у мястэчку 9, а ў той жа час, нардом, саматужныя арцелі, яўшкола зьмяшчаюцца ў канурах. Тут-жа на гэтым сходзе выступае член саюзу мэдсанпрацы, асоба з вышэйшай адукацыяй і кажа: „Ня трэба абвастраць адносіны з духоўнымі санамі, а трэба прасіць іх—можа яны ўступаць самі. Яна, бачыце, прапанавала міжсаюзнаму сходу членаў саюзу стаць на каленкі і зьняць шапку перад нашымі клясавымі ворагамі!

Памірае ў гэтай самай асобы матка. Каб угадзіць местачковай рэлігійнай абыватальшчыне, гэта асоба заклінаецца насіць чорную мансію (жалобу). Свой заклён яна выконвае дасканала.

Па тэрыторыі Лядзянскага раёну праходзілі ўдзельнікі дывізійных манэўраў—чырвонаармейцы. Працоўнае насельніцтва м. Ляды вельмі шчыра спаткала чырвоных байцоў. Полк разьмяшчаецца на кватэрах для адпачынку, на кожную хату па 8-10 чалавек.

Толькі гэты член саюзу не дапушчае трох чырвонаармейцаў у сваю хату (яна жыве толькі з бацькам), не дапушчае таксама з прычыны жалобы.

Вялікае абурэньне і галасы пратэсту працоўных Лядзянашчыны супроць гэткіх учынкаў члена саюзу зьмяшчае райённая насьценгазэта „Наш Шлях", і ўсе насьценгазэты мястэчка крычаць аб гэтых абураючых фактах. Лядзянскі райгрупком мэдсанпрацы бачыць, чуе і ганебна маўчыць. А вось калі весной трэба было з нашага раёну паслаць зубурача на курсы па перападрыхтоўцы апошніх, дык групком дзёр горла зз пасылку якраз гэтага члена саюзу, зубурача Фрыдзіну Цыю. І паслаў.

Прафсаюзная маса Лядзянскага раёну павінна сказаць сваё рашучае слова—ці можа зубурач Фрыдкіна Цыля заставацца далей членам прафсаюзу.

Я. Ветраў.

Рэлігійныя малельні—пад культасьветныя ўстановы.

Напярэдадні рэлігійных сьвятаў—іўдзейскага „Іём-кіпура" і праваслаўны „пакровы" —у горадзе Магілеве адбылася грандыёзная дэманстрацыя.

На мітынг каля тэатру імя Ігнатоўскага сабралася каля 10 тысяч чалавек.

З прамовамі выступалі прадстаўнікі саюзу ваяўнічых бязбожнікаў, скурзаводу імя Лекерта, швейнай фабрыкі, настаўніцтва і інш.

У сваёй рэзалюцыі **працоўныя патрабуюць перадачы цэркваў, кась цёлаў і сынагог для арганізацыі ў іх асяродкаў сацыялістычнай культуры.**

Юр.

40 процантаў прагулаў

АНТЫРЭЛІГІЙНАЯ ПРАЦА СЯРОД ПОЛАЦКІХ РАБОЧЫХ-БУДАЎНІКОЎ НЕ РАЗГОРНУТА.

Полацкае акруговае аддзяленьне саюзу будаўнікоў, як відаць, добра яшчэ сабе не ўявіла значэньне штодзённай антырэлігійнай працы сярод рабочых на вытворчасьці. Клюб, культкамісіі, рабачкомы прытрымліваюцца «кампанейшчыны» ў культпрацы. Няма пералому ў штодзённым палепшаньні культпрацы, у сыстэме антырэлігійнай працы няма вядомае цілянавасьці. Таму на вытворчасьці праводзяць агітацыю баптысты, і яны не атрымліваюць належнага адпору. З шасьці рабочых камітэтаў ў горадзе, якія аднаюць будаўніч. рабочых, няма ні пры водным рабочых камітэце ячэйкі бязбожнікаў. Пры адным рабочым камітэце (№ 1) была ячэйка, але яна не працуе ужо поўгада, невядома дзе ўзносы ячэйкі, дзе бюро і яе сэкратар. Так пастаўлена антырэлігійная праца сярод 700—800 гарадзкіх будаўнікоў.

Зараз адбываюцца яўрэйскія антырэлігійныя сьвяты. За тры дні да сьвятаў пачалі праводзіць антырэлігійную працу.

4-га кастрычніка наладзілі антырэлігійны вечар, каб адцягнуць увагу рабочых ад сінагогі. Аркестр бязупынна граў, пустыя глухія сьцены дрыжэлі ад гукаў аркестру. Але і гэта не дапамагло, і ў клюб зьявілася ўсяго дзесяць чалавек рабочых, а ўсяго рабочых яўрэяў у горадзе каля 700 чалавек. **На заўтра на працу не зьявілася 40 проц. рабочых яўрэяў.** Вось вынікі кампаніі ў антырэлігійнай працы. Клюб не вядзе абсалютна ніякай антырэлігійнай штодзённай працы.

Трэба полацкаму савету прафсаюзаў наогул праверыць стан культпрацы сярод будаўнічых рабочых, працаздольнасьць асобных камісій рабачкомаў.

Трэба вінаватых у неправядзеньні культпрацы і антырэлігійнай працы на вытворчасьці прыцягнуць да прафсаюзнай і партыйнай адказнасьці. Патрэбна ня толькі кампанія, але і штодзённая антырэлігійная праца на вытворчасьці. На прадпрыёмствах трэба арганізаваць ячэйкі бязбожнікаў і ўцягнуць у іх будаўнічых рабочых.

І. Ям.

На 300 калгасаў усяго два гурткі бязбожнікаў.

(Аршанская акруга).

Для антырэлігійнай працы калгасы—самая спрыяючая глеба. Такіх спрыяючых умоў для антырэлігійнай працы на вёсцы, сярод разьяднанага сялянства няма. Аднак, антырэлігійная праца ў калгасах Аршанчыны пастаўлена вельмі дрэнна. Акруговыя і райённыя саветы саюзу бязбожнікаў на антырэлігійную і наогул на культпрацу ў калгасах ня зьвяртаюць увагі.

Па ўсёй акрузе толькі ў двух калгасах ёсьць гурткі бязбожнікаў з 57 сябрамі ў іх. Гэта ў той час, калі па акрузе ўжо налічваецца каля 300 калгасаў! Антырэлігійных бібліятэчак у калгасах, за вельмі рэдкім выключэньнем, няма зусім.

З прычыны такога становішча, у калгасах часта назіраецца выкананьне розных рэлігійных абрадаў і забабонаў, калгасьнікі яшчэ маюць сувязь з папамі.

Нязвычайна дзікі выпадак быў у калгасе **«Ленінскі Прамень»**. У гэтым калгасе загнілася вада ў калодзезі. Замест таго, каб калодзезь пачысьціць, калгасьнікі і калгасьніцы маліліся над ім і сыпалі ў яго свінцоны мак.

У калгасе „Віхраны", Мсьціслаўскага райёну, калгасьнікі даюць папу па паўтара пуда хлеба на аднаўленьне царквы, а ў той жа час у калгасе няма ні хаты-чытальні, ні чырвонага кутка.

Калгасьніцы з «Яснай Паляны», Круглянскага райёну, ходзяць за 30 вёрст у м. Бялынічы, Магілеўскай акругі, каб пакланіцца абразу „цудатворнай маткі боскай".

Такіх прыкладаў можна было-б падаць яшчэ шмат. Але і пададзеных досыць яскрава сьведчаць аб тым, што ў калгасах антырэлігійн. працы няма. Гэта надта ўскладняе разгортваньне і іншай культпрацы сярод калгасьнікаў.

Акруговыя і райённыя саветы бязбожнікаў павінны зьвярнуць на антырэлігійную працу ў калгасах асаблівую ўвагу. Трэба ў кожным калгасе арганізаваць гурткі бязбожнікаў, даць туды антырэлігійную літаратуру і мець з гурткамі жывую сувязь.

А. К.

Бязбожнікі ўзварухнуліся.

(Заслаўскі р., Меншчына).

У заслаўскім нардоме адбыўся антырэлігійны мітынг-сход, дзе быў заслуханы даклад аб клясавай сутнасьці рэлігіі.

Асабліва пасьпяхова праводзіць антырэлігійную працу Ратамская ячэйка бязбожнікаў, якая практыкуе выезды ў суседнія вёскі для правядзеньня антырэлігійных сходаў.

Райсавет бязбожнікаў падалей вызначыў шэраг мерапрыёмстваў па ўмацненьню антырэлігійнай працы. З 1 лістапада адчыняюцца раённыя курсы для падрыхтоўкі антырэлігійных працаўнікоў.

Райсавет бязбожнікаў, улічваючы патрэбаваньні працоўных м. Заслаўля аб перадачы царквы пад клюб, пастанавіў узьняць перад адпаведнымі органамі хадайнічаньне аб хутчэйшым задаволеньні гэтага патрабаваньня.

Бязбожнік

М. ТАРНОЎСКІ *).

Айда.

I.

Маладая, энэргічная, трохі нахмураная, але прыемная дзяўчына ўсюды вьвяртала на сябе ўвагу Яе смуглявае аблічча, каротка падстрыжаныя косы і карыя вочы выяўлялі сабой сымбаль бурлівага жыцьця, сымбаль працы і барацьбы.

Калі яна выступала на сходзе, то голас яе гучэў, як віёлёнчэль. Калі змаўкала—грудзі яе хваляваліся, як вада ў моры, што прыплывае да берагоў.

Гэткаю была Айда.

А была яшчэ іншаю, але гэта—пасьля.

А цяпер.

— Мы, жанчыны, адсталі ад мужчын на дзесяткі гадоў і на гэта трэба зьвярнуць нам увагу. Так далей нельга нельга!

Вось так Айда гаварыла на сходзе жаночай арганізацыі.

А некаторыя думалі:

— Чаму-ж адсталі? Вось-жа мы працуем разам з таварышамі ў партыі і вытрымліваем крок...

Але адначасова ўсе ведалі, што іх так мала—так мала жанчын, якія хочуць працаваць разам з таварышамі для прыгожай будучыні.

Ведала гэта і Айда. І таму яшчэ з большай сілай дадавала:

— Мы мусім нясупынна пашыраць свае шэрагі. Мусім стаць народуе з мужчынамі!

Тады яна спынялася, нібы чакаючы адказу, і ў залі было так ціха, ціха... Толькі за вакном вуліца клёкатала і нібы клікала:

— Сюды, сюды, да мяне! Тут знойдзеце тысячы—мільёны такіх абязьдоленых, галодных, якія стануць з вамі плячо—ў плячо на барацьбу за лепшае новае жыцьцё!

І Айда зноў, нібы чуючы заклік вуліцы, узвышала голас і заклікала таварышак да актыўнай працы—да агітацыі, усюды—нават на вуліцах...

І ня раз бачылі мы Айду на пляцу, як яна са сьцяжком на грудзёх гаварыла да мас...

II.

Сёньня Айда сядзела дома. Гэта не таму, што яна так хацела, не... А таму, што на Кравецкай фабрыцы—забастоўка, і яна рыхтавала адозву, каб прадставіць яе заўтра на пасяджэньне кам'ячэйкі.

Нехта ціхенька пастукаў.

Айда прыкрыла напісанае і падышла да дзьвярэй, адчыніла, і ён увайшоў.

Гэта быў Дэн—арганізатар партыйнага аддзелу.

— Вы?—запытала.

— Я... Хіба дзіўна вам, Айда!

— О, не,—усьміхнулася і зачырванелася... — Але я думала, што можа... Сядайце...

— Вы думалі, што я шпег?.. Га?..

— А, не, ня вы, а...

— Ня бойцеся... Цяпер накуль што шпегам няма работы... А можа... Але мы маем важныя справы... Таму я прышоў...

— Забастоўка?—спытала Айда.

— Так. Заўтра да Шульца прывязуць некалькі сот штрэйкбрэхераў. Трэба, чаго-б гэта ні каштавала, не дапусьціць іх... Пікетчыкам трэба даць падмогу... Трэба наладзіць дэманстрацыю ўсіх, што бастуюць. Выйдуць таксама многія арганізацыі, якія спачуваюць нам...

— А што ўлады?

— Напэўна—забаранящь будуць... Але мы сваё павінны зрабіць... Ад гэтага залежыць перамога. У кожным разе трэба старацца правесьці гэта мірным шляхам...

У Айды зачырванеліся шчокі... Вочы гарэлі агнём...

Такая была Айда.

III

Перад вялікай фабрыкай Шульца тоўпілася шмат людзей. У фабрыцы было пуста, а перад брамаю, на ходніку, праходжваліся, як звычайна, пікетчыкі са стужкамі цераз плячо і з вялікімі табліцамі.

Надпісы на табліцах паясьнялі ўсё: «Мы не рабы—мы людзі. Дамагаемся людзкіх умоў працы».

«З сучаснага нашага заработку мы ня можам пражывіць сябе і свае сям'і. Патрабуем большай платы. Патрабуем зьмяншэньня гадзін працы».

З кожнай хвілінай лік забастоўшчыкаў узрастаў.

На ходніку зьбіраліся грамады. Нямала было і паліцэйскіх агентаў.

Нешта падрыхт ўвалася, але невядома што...

Была дзесятая гадзіна, калі на рагу вуліц паказаўся грузавік, напоўнены штрэйкбрэхерамі. А наперадзе і па бакох—паліцыя...

Далей другі, трэці... Рабочыя заварушыліся.

Калі грузавікі апынуліся перад фабрыкай, пачулася страшнае гудзеньне і заклікі да штрэйкбрэхераў, каб ня ішлі на работу.

Дарога была загароджана рабочымі. Да брамы цяжка дабрацца... Дарэмныя былі захады паліцыі разагнаць натоўп.

Але вось з супроцьлежнага боку насыпаліся на штрэйкбрэхераў каменьні. Гэта быў знак паліцыі для атакі на забастоўшчыкаў.

Паліцыя гэтага толькі чакала.

Забастоўка была справакавана, і панскія найміты дзіка кінуліся на рабочых...

Страшэнны крык, сьвіст і лямант—разьдзіралі паветра... Натоўп пагэройску бараніўся. Але што значыць бязбройная маса перад моцна ўзброенаю паліцыяй і шпегамі... Кроў палілася па вуліцы...

Ня страцілі прытомнасьці перадавыя таварышы. Іх абавязкам было вывесьці дэманстрантаў з гэтай вуліцы, і яны ўзяліся за работу.

Арганізатар Дэн кінуўся наперад, заклікаючы выходзіць на Майн-вуліцу. Пярэднія калёны рынуліся на паліцыю, якая перашкаджала выходзіць з гэтага боку. З тылу напіралі новыя аддзелы паліцыі, але выхад на Майн-вуліцу ўжо быў адкрыты, бо паліцыя і шпегі пайцякалі... Усе падаліся да выхаду...

Здаецца, наймацнейшыя ўдары грому не зрабілі-б такога ўражаньня, як тое, што тут-жа перад імі, на адным з будынкаў зататакаў кулямёт, каля яго мітусіліся паліцыянты. Дарога была перарэзана, і было відавочна, што паліцыя зьбіраецца ўчыніць нябывалую расправу.

Тут трэба было нешта прыдумаць. Нешта тэрмінова трэба было зрабіць, каб спыніць страляніну... Але што?

Па меры таго, як рабочыя набліжаліся да выхаду, кулямёт рабіўся больш лютым і ўсё гусьцей сыпаў градам куль, выхад на другую вуліцу стаў немагчымы.

Рабочыя зьмяшаліся. Бегчы ўперад—нельга, бо хто адважыцца—таму сьмерць.

Вуліца абярнулася ў пекла. Тыя, што былі ззаду, са ўсёй сілы падаваліся наперад. Яшчэ некалькі хвілін і пярэдняя частка рабочых пападзе пад град куль.

Кіраўнікі забастоўкі ня ведалі, што рабіць: забастоўка справакавана, і маса рабочых загіне ў гэтым замкнёным коле сьмерці...

IV

— Дзе-ж Айда?—пыталіся трывожна адзін у аднаго.

— Была тут нядаўна,—адказвалі на пытаньне. І зноў адбіваліся адны ад адных, мяшаліся з масаю і імкнуліся наперад.

Дэн напружана сачыў за ўсім, шукаючы магчымасьці выратаваць абкружаных рабочых.

Ён нават не заўважыў, што апынуўся на самым перадзе, дзе падалі кулі.

Вось застракатала па ходніку каля самага яго, і ён убачыў, як упаў таварыш, што стаяў побач з ім.. Пасьля другі... А сам ён пачуў—нібы хто шарпануў чым яго па вуху, і... па твары пачала сьцякаць цёплая кроў...

Праз хвіліну ён пачуў шум у галаве...

Калі-ж ён апамятаўся, яго зрок упаў на дах будынку, дзе быў кулямёт.

Там адбывалася дзіўная падзея.

Дэн зразумеў усё, і яго ахапіла жахлівая трывога. Ён крычаў нікому незразумелыя словы і кінуўся бегчы ў бок будынку. Дэманстранты рушылі да выхаду з замкнёнага, але на момант адкрытага завулку.

Кулямёт больш не татакаў.

Замест яго пачуліся рэвальвэрныя стрэлы на даху будынку, дзе быў кулямёт. Ад першай кулі адзін з паліцыянтаў падняўся і, захістаўшыся, стромгалаў паліцэў на вуліцу... Але паліцыя адказала стрэламі, і дзяўчына, што стаяла на краі будынку, страляючы,—схапіўшыся за грудзі, таксама палацела ўніз...

Гэта была Айда.

Калі Дэн дабег да будынку—на ходніку стагнаў у перадсьмяротных муках паліцыянт, а каля яго з разьбітай галавой—акрываўленая Айда.

— Айда, Айда! Нашто гэта?—залемантаваў Дэк, прыпадаючы да твару дзяўчыны.

— Так трэба, Дэн, так трэба!.. Мы, жанчыны, адсталі ад мужчын... Там на будынку—сьмерць... Я пашла і... і... Бывайце здаровы!..

Таварышы

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ ЎРАДУ БССР

Пастанова Савету Народных Камісараў Беларускае ССР

ПРА АСЛАБАНЕНЬНЕ АКАДЭМІКА ЛАСТОЎСКАГА, В. У., АД АБАВЯЗКАЎ НЕАДМЕННАГА САКРАТАРА БЕЛАРУСКАЕ АКАДЭМІІ НАВУК І АКАДЭМІКА НЕКРАШЭВІЧА, С. М., АД АБАВЯЗКАЎ ВІЦЭ-ПРЭЗЫДЭНТА БЕЛАРУСКАЕ АКАДЭМІІ НАВУК.

У зьвязку з тым, што з боку Неадменнага Сакратара Беларускае Акадэміі Навук акадэміка Ластоўскага, Вацлава Ўсьцінавіча, і з боку Віцэ-Прэзыдэнта Акадэміі акадэміка Некрашэвіча, Сьцяпана Міхайлавіча, дапушчана надрукаваньне ў выданьнях Акадэміі Навук шэрагу прац паасобных аўтараў, праводзячых у гэтых працах погляды зусім несумяшчальныя з палітыкаю савецкае ўлады, а часамі і погляды варожыя савецкай уладзе, і за дапушчаньне надрукаваньня ў выданьнях Акадэміі работы яўнага ворага Савецкай Беларусі Я. Станкевіча, які знаходзіцца за мяжою на службе польскага фашыстаў і вядзе сыстэматычную актыўную працу супроць савецкай улады,—Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Прыняць да ведама, што Прэзыдыум Беларускае Акадэміі Навук вынес 11 кастрычніка пастанову, у якой рэзка асудзіў зробленую памылку, прызнаўшы недапушчальным надрукаваньне ў выданьнях Акадэміі працы ворага Савецкай Беларусі Я. Станкевіча, і правільна падкрэсьліў ролю і задачы Савецкай Акадэміі, як Акадэміі пралетарскае дзяржавы.

2. Аслабаніць акадэміка Ластоўскага, Вацлава Ўсьцінавіча, ад абавязкаў Неадменнага Сакратара Беларускае Акадэміі Навук і акадэміка Некрашэвіча, Сьцяпана Міхайлавіча, ад абавязкаў Віцэ-Прэзыдэнта Акадэміі.

3. Даручыць Беларускай Акадэміі Навук зрабіць дадатковыя выбары новых асоб на паказаныя пасады і падаць пасьля выбараў адпаведныя кандыдатуры на зацьверджаньне Савету Народных Камісараў, згодна існуючага Палажэньня аб Беларускай Акадэміі Навук.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. ГАЛАДЗЕД.

Нам. кіраўніка справаў Савету Народных Камісараў і Эканамічнай Нарады БССР Л. ДУБАВІЦКІ.

16 кастрычніка 1929 г.
г. Менск.

Стан азімых усходаў і ўраджай бульбы на 1-е кастрычніка 1929 г.

Сельская гаспадарка на дадзеным узроўні тэхнікі, пры сучасных суадносінах паміж сельскай гаспадаркай і прамысловасьцю, займае пераважнае месца ў народнай гаспадарцы Беларусі.

І таму ня дзіва, што за разьвіцьцём сельскай гаспадаркі, за ростам яе мы пільна сачым.

За разьвіцьцём усходаў азімых мы сачым на працягу ўсяго іх вэгэтацыйнага пэрыяду.

Значная колькасьць людзей і ўстаноў прымае ўдзел у адказе на гэта пытаньне.

Асноўныя зьвесткі аб стане азімых усходаў ЦСК Бел. атрымлівае ад статыстычнай агентуры (добракоры, райстатыстыкі).

Побач з імі ў раёнах працуюць раённыя экспэртныя камісіі, у склад якіх уваходзяць асобы, якія маюць непасрэднае дачыненьне да сельскай гаспадаркі: РВК, РЗЧ, агранамія, падатковая камісія, страхагэнтура, прадстаўнікі с.-г. кааперацыі, райстатыстыкі.

Вынікі райэкспэртнай камісіі разглядаюцца акруговай экспэртнай камісіяй, дзе да ўдзелу ў працы далучаюцца ячыч і прадстаўнікі дзяржхлебінспэкцыі, КСУД, Саюзхлеб, акрфінадыль, акрфін.

Акруговыя матар'ялы паступаюць у ЦСК Бел., дзе на пасяджэньні Экспэртнага Савету пры СНК пад старшынствам кіраўніка ЦСК і пры ўдзеле 14-ці прадстаўнікоў ад розных устаноў выводзяцца канчатковыя вынікі, падкрэсьленыя мэтэаролягічнымі дадзенымі Белгэофіз'а пасьля грунтоўнага абмену думкамі паміж удзельнікамі савету, Дзяржпляну, НКФ, ДХІ, Навукова-Дасьледчы Інстытут і інш.

Асьцярожна, моцна крытыкуючы, яшчэ і яшчэ раз праверыўшы дадзеныя райстатагэнтуры, райЭК, акрЭК, нават сваімі ўражаньнямі пры паездках па агрутах, даюцца станоўчыя адказы на актуальнае пытаньне—віды на ўраджай і ўраджай.

Вось вынікі чарговага пасяджэньня Экспэртнага Савету пры СНК Бел. ад 8-Х—29 г. аб стане азімых усходаў і ўраджаі бульбы на 1-Х—29 г.

Як жыта, так і пшаніца далі балавую ацэнку трохі вышэйшую мінулага году. Гэтаму спрыяў болей ранні сеў азімых (1-IX) у гэтым годзе ў параўнаньні з мінулым годам (4-IX).

Бульба ў гэтым годзе на працягу свайго росту ўсё павялічвала балавую ацэнку і ніканчатковыя дадзеныя ўраджаю бульбы такія самыя, як і ў мінулым годзе (617 проц. з гэктара), а ўраджай мінулага году лічыцца добры.

Надвор'е пры ўборцы бульбы ў гэтым годзе было спрыяючае, так што проц. бульбы, годнай для захаваньня, большы чым у мінулым годзе, калі значны проц. бульбы згніў.

Як бульба, так і азімыя нам даюць добрыя віды на будучыню азімых, так і на сучаснае.

Уборка бульбы ўжо падыходзіць да канца.

Канчатковыя зьвесткі будуць дадзены ў хуткім часе.

Аграном Берштэйн Н. С.

ВЫПУСК СЯЛЯНСКАГА ЎНІВЭРСЫТЭТУ.

29-га верасьня адбыўся выпуск Сялянскага Ўнівэрсытэту, арганізаванага пры Беларускай сельска-гаспадарчай Акадэміі.

У першыя часы сваёй арганізацыі залічана было ў Унівэрсытэт 110 асоб, але частка слухачоў адсялася, і ўнівэрсытэт скончыла такім чынам 80 асоб. У ліку скончыўшых: беднякоў—20 проц., серадняковў—76 проц., батракоў—4 проц. З іх мужчын—88 проц., жанчын—12 проц. Па ўзросту—да 25 год—44 проц., ад 26 да 30 год—20 проц., ад 31 да 40 год—28 проц., ад 41 і больш—8 проц

З вышэйпададзеных лічбаў відаць, што Сялянскі Ўнівэрсытэт абслугоўвае беднату, серадняцкую частку насельніцтва і батракоў. Тэрмін навучаньня ў Сялянскім Ўнівэрсытэце разьлічан быў на 2 гады. Практычныя заняткі праводзіліся пераважна ўвосень і вясной у вучэбнай фэрме Акадэміі, садзе, гародзе і інш.

Выкладчыкамі Сялянскага Ўнівэрсытэту былі наступныя навуковыя працаўнікі Акадэміі: прафэсараў—6 асоб, дацэнтаў—3, асыстэнтаў—11.

У мінулым 1927-1928 г. у 18 слухачоў былі закладзены паказальна-дасьледчыя вучасткі.

З наступнага году мяркуецца адчыніць пры Акадэміі Беларусі завочны Сялянскі Унівэрсытэт. Падрыхтоўчая праца да арганізацыі яго ўжо вядзецца.

Т. Сташкевіч.

ХРОНІКА

Вынікі 1-й усебеларускай студэнцкай культнарады.

18 кастрычніка зачынілася 1-ая усебеларуская нарада культпрацаўнікоў студэнцкіх арганізацый, у якой прыняло ўдзел 60 дэлегатаў ад усіх навучальных устаноў БССР.

Культнарада разгледзіла пытаньні аб масавай палітвыхаваўчай працы ў навучальных установах, аб грамадзкай працы студэнтаў па-засьценамі навучальных устаноў, аб масавым удзеле студэнцтва ў працы па ліквідацыі няпісьменнасьці.

Дэлегаты ў спрэчках завастралі ўвагу на неабходнасьць большага разьвіцьця грамадзкай працы студэнтаў па-засьценамі ВНУ і тэхнікумаў. Нарада вырашыла на гэту працу накіраваць ня менш 60 проц. агульнай колькасьці студэнтаў. Аднэй з ударных задач нарада лічыць удзел студэнцтва ў ліквідацыі няпісьменнасьці.

Па дакладу аб друку і самакрытыцы ў насьценгазэтах навучальных устаноў нарада выказалася аб неабходнасьці шырокага разгортваньня самакрытыкі і паставіла перад студэнцкімі насьценгазэтамі задачу—правесьці праверку выкананьня пастаноў ліпеньскага пленуму ЦК УсеКП(б) па пытаньню аб кадрах спэцыялістаў. Побач з гэтым нарада зазначыла на неабходнасьць даваць больш рашучы адпор праявам чуждай ідэалёгіі і змагацца з антымарксысцкімі ідэямі, якія часта распаўсюджваюцца з кафэдр ВНУ.

Каб студэнцтва больш чула выяўляла антымарксысцкія выступленьні, нарада даручыла ўсім студэнцкім арганізацыям шырока разгарнуць сетку гурткоў па вывучэньні марксысцка-ленінскай тэорыі і бягучых палітычных пытаньняў.

Грубыя парушэньні калдагавору.

Гаспадарнікі прыцягваюцца да адказнасьці.

Як зараз устаноўлена, з боку адміністрацыі Менскай хладабойні сыстэматычна парушаліся пункты калдагавору. Так, у альбуміннавым цэху адміністрацыя выплачвала рабочым зарплату не па зьдзельнай сыстэме, як гэта было вызначана ў дагаворы. З боку завкому і бухгальтэрыі таксама нагляделіся нядбайныя адносіны да праверкі выкананьня дагавору. Рабочаму-сьлесару зарплата выплачвалася замест 6 разраду па 4.

Саюз запрапанаваў адміністрацыі заводу выплаціць розьніцу неаплачаных грошай рабочым, пачынаючы з 1 студзеня 1929 г.

У выпадку невыкананьня гэтага адміністрацыя будзе прыцягнута да адказнасьці.

Правільна наладзіць хлебныя перавозкі.

Белбюро ЦК чыгуначнікаў, абгаварыўшы пытаньне аб ходзе хлебазагатовак, пастанавіла шырока абгаварыць гэта пытаньне на рабочых сходах. Клюбы і вагоны-клюбы павінны шырока растлумачыць рабочым пытаньні клясавай барацьбы навакол хлебазагатовак.

Белбюро завастрыла ўвагу адміністрацый чыгунак на тым, каб былі правільна наладжаны хлебныя перавозкі.

Швэйныя фабрыкі—на бесперапынны рабочы тыдзень.

Прэзыдыум ЦП саюзу швэйнікаў запрапанаваў трэсту распрацаваць да 1 лістапада матар'ялы і пляны пераводу швэйных прадпрыемстваў Беларусі на бесперапынны рабочы тыдзень.

Апарат саюзу ўжо перайшоў на бесперапынны рабочы тыдзень.

Рабочыя-тэкстыльшчыкі ліквідуюць няпісьменнасьць.

З мэтаю ліквідацыі няпісьменнасьці сярод рабочых саюзу тэкстыльшчыкаў Менску арганізаваны 4 лікпункты, якія ахапілі зьвыш 100 чал. Лікпункты слаба пакуль-што працуюць у пік тэкстыльшчыкаў.

Аварыя на каналізацыйных работах.

16 кастрычніка на каналізацыйных работах здарылася аварыя шчыліны ў галерэі, якая ідзе да насоснай станцыі. Інжынэр камгасу па каналізацыі т. Кавокін у гутарцы з нашым супрацоўнікам адзначыў, што гэта аварыя ня можа адбіцца на агульным ходзе работ па будаўніцтву каналізацыі. Пасьля забэтаніраваньня дна рэзэрвуару шчыліны будуць у бліжэйшыя 2 тыдні зьнішчаны. Страта ад аварыі будзе ня больш 200-300 руб.

Студэнцтва падрыхтоўвае рабочых у ВНУ і рабфакі.

Студэнцкія арганізацыі Беларусі разгортваюць шырокую працу па падрыхтоўцы рабочых у ВНУ, рабфакі і тэхнікумы. Падрыхтоўчыя курсы для рабочых будуць арганізаваны пры С.-Г. Акадэміі і Віцебскім гарбюро студэнцтва.

Гэткія-ж курсы адчыняюцца студэнтамі Гомелю і Магілеву.

Дабраахвотныя інструктарскія групы.

Прэзыдыум усебеларускага камітэту саюзу харчавікоў прызнаў неабходным прыцягнуць рабочых-дабраахвотнікаў для ўдзелу ў працы саюзнага апарату. Дабраахвотнікам-прафактывістам будзе даручацца правядзеньне розных абсьледваньняў і нарад.

Хуліганы выключаюцца з саюзу.

За хуліганска-зьверскі ўчынак выключаны цэнтральным праўленьнем з саюзу рабочыя-будаўнікі Метковіч і Кудраў.

Хуліганы накінуліся на работніцу Майсеева, абгалілі яе і аблілі адзеньне растворам вапны. Па затрабаваньню бабруйскіх рабочых-будаўнікоў справа перададзена ў пракуратуру.

СПРАВАЧНЫ АДДЗЕЛ.

КАТЫРОЎКА ПАЗЫК НА 20-21 КАСТРЫЧНІКА 1929 г.

	Куп.	Прад.
1 6 проц. выйгр. паз.	4.96,5	—
Бяспроц. выйгр. паз. 26 г.	128.	130.
Выйгр. пазыка 1929 г.	100.45	100.85
10 проц. выйгр. паз. 27 г.	25.46	25.56
3 -ясялянск. выйгр. паз. 27 г.	5.02	—
Дзярж. паз. узм. сял. гас.	10.4	10.76
1 выйг. паз. індустр. 27 г.	25.26	25.36
2 " " " проц.	25.38,5	25.48,5
2 " " 6-проц.	25.38,5	25.48,5
11 проц. дзярж. паз. 28 г.	101.53	101.58
12 проц. рэнтная паз. 27 г.	104.61	—

Галавацяпы на таварнай станцыі МББ.

У канцы верасьня г. г. працаўнікамі Навукова-Дасьледчага Інстытуту імя Леніна (Цэнтр. Хімічн. Лябараторыя) браліся ўзоры глеб Менскай акругі для складаньня карты кіслотнасьці. Частка гэтых узораў былі высланы грузам са станцыі Пухавічы і Негарэлае, бо працаўнікі ня мелі магчымасьці захапіць іх з сабою па прычыне іх значнага цяжару. На кожным з грузаў было дакладна адрасавана назва ўстановы, куды груз пасылаецца. Але ў пачатку кастрычніка калі працаўнікі прыехалі на месца, каб зараз-жа ў лябараторыі прыступіць для аналізаў, дык ніякіх паведамленьняў адносна прыбыцьця узораў у Менск або НДІ няма. Адзін з працаўнікоў загэтым званіў 2 разы—5 і 12-Х па тэлефону на таварную станцыю ў кантору з запытаньнем, ці няма ў вас для НДІ грузаў з зямлёю?

Адказ: Пачакайце каля тэлефона, пашукаем па кнігах. Чакае. Праз 10 хвілін адказваюць: «няма, мабыць, яшчэ ня прыйшлі».

Дзівяцца працаўнікі. Што-ж такое? Справа ў тым, што ўзоры, валяючыся па вагонах, могуць пашкодзіцца, бо кожны з іх абгорнуты толькі звычайнай шэрай паперай і перавязаны шпагатам.

Паехалі 14-Х аж два працаўнікі Ін-ту на таварную станцыю. У вакзалі канторы ім цэлер сказалі, што грузы прышлі, і паказалі накладныя. На накладных было ясна напісана, што яны прыбылі 2-Х і 4-Х. Ня гледзячы на тое, што зямля правалялася больш за 10 дзён на складзе, працаўнікі ўзрадаваліся. Нарэшце, нашлі такі.

Але радасьць аказалася даволі кароткай, бо калі ёсьць паперка, дык гэта ня значыць, што ёсьць груз. 2 дні шукалі вялізарную скрыньку з зямлёю. Няма—ды толькі, хоць усе дакумэнты на яе існаваньне ёсьць. Нашлі толькі частку узораў, што былі высланы з Негарэлага. Адзін са служачых—галавацяпскі — заявіў толькі: «Можа гэтую зямлю мы ўжо з таргоў прадалі?». А ўзораў няма і няма. А дзяржава траціла грошы на пасылку працаўнікоў, на разьезды, на харчаваньне іх. Хто павінен адказваць за такое безгалоўе.

А. Вечар.

Вынікі расьсьледваньня.

Аршанская акруговая РСІ паведамляе, што допіс „Дзэрэтыр з партбілетам у кішэні" пры расьсьледваньні пацьвердзіўся; пастановай праверачнай камісіі па чыстцы шэрагаў партыі дзэрэтыр Таптуноў выключан з шэрагаў партыі.

***

Допіс „Як Міхеєўскі поп дурачыць сельсавет" расьсьледваньнем поўнасьцю пацьвердзіўся: пастановай Халопеніцкага РВК поп Быкаў абкладзен індывідуальным падаткам.

***

Расьсьледваньнем Аршанскай акр. РСІ фэльетону, зьмешчанага ў газэце „Савецкая Беларусь" пад загалоўкам „Вінавата сьнежная завея", выяўлена, што справа гр. Мядорава, пасланая ў ЦВК Беларусі, праляжала ў Нарэўскім РВК 48 дзён з прычыны нядбайных адносін да працы сэкратара Мархлеўскага, за што яму абвешчана суровая вымова.

***

Нарсьледчы Бабруйскай акругі, расьсьледаваўшы допіс, знайшоў, што доктар Сямёнаў нядбайна адносіўся да сваіх абавязкаў, на падставе чаго Сямёнаў прыцягваецца да судовай адказнасьці.

***

Пры расьсьледваньні допісу „Старшыня сельсавету—абаронца кулака" устаноўлена, што факты ў асноўным пацьвердзіліся. Старшыня сельсавету пры надзяленьні зямлёй Шаўкаль Марч і іншых скрыўляў клясавую лінію. Трэба адзначыць, што Горацкі РВК не рэагаваў на дзейнасьць сельсавету, у выніку чаго старшыні Горацкага РВК пастаўлена на від, а старшыні с-с Новікаву абвешчана суровая вымова з папярэджаньнем.

Допіс „Грахі Сьнядзінскага сельсавету" быў накіраван Мазырскай акруговай РСІ, дзе высьветлілася, што факт выпіўкі на вечары ў школе ў дзень сьвята „Кастрычнікавай рэвалюцыі пацьвердзіўся. Настаўніку Кудры, які прымаў актыўны ўдзел у гэтай выпіўцы, абвешчана вымова.

***

Сураўскі РВК КП(б)Б, расьсьледваўшы допіс „Згубілі твар комсамолу", знайшоў, што факты, зьмешчаныя ў допісе, адпавядаюць сапраўднасьці. За сыстэматычныя п'янкі і хуліганства сэкратара Станькаўскай ячэйкі з камсамолу выключылі.

Пры новым складзе бюро ячэйкі праца значна палепшылася.

***

Менская акруговая кантрольная камісія КП(б)Б РСІ паведамляе, што допіс з газэты „Сав. Бел." (№ 61) „Пад кантроль мас"—будзе скарыстаны пры чыстцы апарату.

***

Па сутнасьці заметкі аб спажывецкім таварыстве Любіньскі РК КП(б)Б паведамляе, што ўвесь хлеб разьмяркоўваецца выключна сярод беднаты. Калфоид Марчна хлебам забясьпечваецца праз кааперацыю, а не за залік хлеба для беднаты.

***

Допіс „Шкоднік пасеўкампаніі" расьсьледваў начальнік Халопеніцкага раёну, які знайшоў, што факты, адзначаныя ў допісе, пацьвердзіліся, але ў зьвязку з тым, што гэта злачынства зроблена ў 1926 годзе, справа па гэтаму пытаньню спынена.

Пачынаецца чыстка ячэйкі НКА.

У аўторак, 22-га кастрычніка, а 7 гадзіне ўвечары ў клюбе „Чырвоны Дрэваапрацоўшчык" (Савецкая, 125) пачынаецца чыстка ячэйкі КП(б)Б Наркамасьветы.

На сход запрашаюцца рабочыя і работніцы заводу „Дрэваапрацоўшчык".

Просьба да рабочых іншых прадпрыёмстваў і ўсіх асьветнікаў зьявіцца на чыстку ячэйкі НКАсьветы.

БЮРО ЯЧЭЙКІ.

Што слухаць па радыё.

Нядзеля, 20-га кастрычніка.

9-30—Сялянскі бязбожнік—раніцнік.
10-40—Палітычны і эканамічны агляд на тыдзень.
11-20—Сьпявайце разам з намі.
12-00—Агляд сёньнешніх і цэнтральных і мясцовых газэт.
16-30—Рабоча-сялянскі радыё-унівэрсытэт:—тэхніка самадукацыі.
17-00—Час актывісткі, работніцы і сялянкі.
17-40—„Чырвоная Зьмена" па радыё.
18-30—Рабоча-Сялянскі Радыё-Унівэрсытэт Матэматыка і прыродазнаўства
19-30—Літаратурны тыдзень.
20-30—Канцэрт.
23-00—Інфармацыя.

Панядзелак, 21 кастрычніка.

17-00—Сялянская радыё-газэта (польск. аддзел).
17-40—Гадзіна калектывіста—лекцыя па зерناводзтву (Бел. НКЗ).
18-35—Гутарка аб эпідэміі паратыфусу.
20-00—Паверка часу.
20-00—Рабоча-Сялянскі Радыё-Унівэрсытэт—гісторыя клясавай барацьбы і пяцігадовы плян.
21-00—Канцэрт з Дзярж. тэатру.
23-00—Вывучэньне нямецкай мовы.

Апавяшчэньні.

ПЭДГАБІНЭТ.

З 15-га кастрычніка г.г. Пэдгабінэт Менскага Акруговага Інспэктарыяту перайшоў НА БЕСПЕРАПЫННЫ ТЫДЗЕНЬ.

Часы адчыненьня—з 6-10 гадзін штодня.

21-га кастрычніка ў панядзелак, роўна ў 7 гадзін увечары адбудзецца першы сход Сэкцыі Політэхнічнае Асьветы.

Парадак дня:

1) Задачы Політэхнічнай Асьветы (дак. т. Панковіч).
2. Арганізацыйныя пытаньні.

Яўка настаўнікаў, якія запісаліся ў сэкцыю абавязкова.

ДОМ АСЬВЕТЫ.

Сёньня кіно „Сьнегазвал", зьвыш праграмы выступленьне арт. Л. Браўна. Пачатак а 8 і 10 гадз. Панядзелак кіно „Шчасьлівыя кольцы". Пачатак а 8 і 10 гадз.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

ТЭАТР-КІНО

КІНО-ТЭАТР „КУЛЬТУРА".	З панядзелка 21 кастрычніка „З 1-м красавіком" амэрыканская камэдыя ў 6 частках. Звыш праграмы: культфільм у 3-х частках «ПАЛЯВАНЬНЕ НА ГАРЫЛУ».
КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ».	З панядзелка 21 кастрычніка амэрыканскі фільм „Радыё і леў". Звыш праграмы: кіно-хроніка САВКІНО № 57. Пачатак а 7 гадзіне.
1-ы ДЗІЦЯЧЫ КІНО-ТЭАТР „ЮНЫ ПІАНЭР".	З панядзелка 21 кастрычніка „Сэрца Азіі" кіно-нарыс у 6 частках. Звыш праграмы: цікавая камэдыя „Янка піанэр". Ка саадчынена ад 2 гадз.

АПАРАТ БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА
ПЕРАЙШОЎ
НА БЕСПЕРАПЫННЫ
ТЫДЗЕНЬ
З 16 КАСТРЫЧНІКА
Цэнтральная кнігарня з 1 кастрычніка.
Кніжная і канцэлярская базы з 6 кастрычніка.

Беларускаму саюзу малочна-жывёлагадоўчай кааперацыі
ПАТРЭБЕН
на пасаду інструктара-эканаміста кваліфікаваны са стажам
АГРАНОМ-ЭКАНАМІСТ
або эканаміст, які працаваў у галіне сельскай гаспадарні.
АПЛАТА ПА ЗГОДЗЕ.
Заявы і дадзеныя аб ранейшай працы накіроўваць: Менск, Савецкая, 46.

Гр-н Балвановіч Раман Паўлаў, які паходзіць з гр. вёск. Боран, Мелашкоўскага с-с, Слуцкага р-ну зьмяняе сваё імя „Раман" на „Сьцяпан". Асоб, якія маюць пратэсты супроць зьмены імя, просьба паведаміць аб гэтым Бабруйскі Акруговы Загс, паказаўшы сваё імя, імя па бацьку, прозьвішча і месца жыхарства.

Гр-ка ЧЕРЕПКО Праскоўя Нікалаева, якая паходзіць з гр-н в. Лучыцы, Замошскага с-с., Асіповіцкага р-ну, Бабруйскай акругі, дзе і жыхарствуе ў сучасны момант, зьмяняе сваё імя „Праскоўя" на імя „Тамара", асоб якія маюць пратэсты супроць зьмены імя просяць паведаміць аб гэтым Бабруйскі загс, паказаўшы сваё імя, імя па бацьку, прозьвішча і месца жыхарства.

Чэрвеньскі гарсавет паведамляе, што на 2-XI-29 г. назначана справа аб скасаваньні шлюбу гр-на Гурскага Міхася з гр-кай Гурскай Пелагеяй.

ЗГУБЛЕНЫ:

— Біржавы талён № 1486 Дубенка А. Н., выд. Менбіржай Працы, кв. 15.
— Біржавы талён Залівака Д. А., выд. Менск. Біржай Працы, кв. 16.
— Мэтрычн. выпіс Залівака Д. А., выд. Менскім Загсам, кв. 17.
— Сяброўскі білет Шуляк В. А., выд. Менскім саюзам харчавікоў, кв. 18.
— Талён, выд. Менбіржай Працы і спраўка аб агульнай працы, выд. менскім калгасам на імя Шуляк В. А., кв. 19.
— Сяброўскі білет Сямака Ф., выд. ЦП саюзу працасьветы за № 4059, кв. 20.
— Сяброўская кніжка Левінай Ш. М., выд. саюзам мэдсанпрацы, кв. 21.
— Пашпарт Бухман Г. М., выд. Менакрміліц., кв. 22,
— Спраўка Вайнера С. Б., выд. Менскай прафтэхшколай, кв. 23.
— Сяброўскі білет № 7716 Шык К. А., выд. ЦП саюзу працасьветы, кв. 24.
— Чырвонаарм. кніжка Чэчэнец А. А., выд. вайск. вэтэр. лябаратор., кв. 25.
— Сяброўскі білет Лашчынскай Н. Р., выд. саюзам нархарчаваньня, кв. 25.
— Паявая кніжка №1091 Мамыко, выд Бобрск. спаж. т-вам, кв. 663п.
— Паявая кніжка № 721 Коскіна, выд. Бобрск. спаж т-вам, кв. № 663п.
— Паявая кніжка № 95 Саранас, выд. Бобрскім спаж. т-вам, кв. 663.
— Сяброўская кніжка № 65-912 Іванова, выд. Аршанскім Учпрафсожам, кв. 663п.
— Паявая кніжка № 21296 Бараноўскага, выд. спаж. т-вам ст. Слеўнае, кв. 663п.
— Паявая кніжка № 1071 Сейліс, выд. Бобрскім спаж. т-вам, кв. 663п.
— Партбілет за № 0805221, выд. Мазырск. арганізац., 2) Сяброўскі білет за № 846, выд. Мазырск. саюзам дрэваапрацоўн. Целяпуна А., кв. 664п.
— Вучотна-конская карт. Войціна А. В., выд. Чэрвенск. вайсковым сталом кв. 711п.
— Вучотна-конская карт. Гаўрыленка В. І., кв. 712.

БАЛЯНС

Аршанскага Трэсту Мясцовай Прамысловасьці „ПРАМТРЭСТ"

НА 1-е КАСТРЫЧНІКА 1928 ГОДУ.

АКТЫЎ. *ПАСЫЎ.*

№№	НАЗВА РАХУНКАЎ	СУМА Прыватная	СУМА Агульная
	I. Маемасьць.		
1.	Будынкі і пабудовы	340405—48	
2.	Абсталяваньне і машыны.	240097—23	
3.	Інвэнтар	43671—29	624174—00
	II. Нязкончаныя будынкі і пабудовы	91301—48	91301—48
	III. Нязкончаны капітальны рамонт	872—81	872—81
	IV. Матар'ялы.		
1.	Сыравіна і асноўныя матар'ялы	135016—98	
2.	Дапаможныя матар'ялы	33643—44	
3.	Апал	18988—74	187649—16
	V. Нязкончаная вытворчасьць.		
1.	Саўгаспадарка Якаўлеўск. фабрыкі	329—70	329—70
	VI. Паўфабрыкаты	34305—92	34305—92
	VII. Тавары, прадукты і гатовыя вырабы.		
1.	Тавары і прадукты	10444—42	
2.	Гатовыя вырабы	123268—46	
3.	Выкананыя заказы (няздадзеныя).	2346—39	136059—27
	VIII. Грашовыя сродкі.		
1.	Каса	898—21	
2.	Бягучыя рахункі	9151—06	10049—27
	IX. Паі і акцыі	1751—40	1751—40
	X. Каштоўныя і процантныя паперы	552—50	552—50
	XI. Вэксалі і дакуманты да атрыманьня.		
1.	Вэксалі ў партфэлі	23098—84	
2.	Вэксалі ў вучоце	187527—38	210626—22
	XII. Падсправаздачныя сумы	5655—52	5655—52
	XIII. Дэбіторы.		
1.	Рабочыя і служачыя	1083—65	
2.	Дастаўшчыкі	12529—51	
3.	Пакупнікі	29999—69	
4	Розныя дэбіторы	18315—36	
5.	Няпэўныя дэбіторы	24274—60	86202—81
	XIV. Выдаткі будучага часу.	8503—89	8503—89
	БАЛЯНС.	—	1398033—95

№№	НАЗВА РАХУНКАЎ	СУМА Прыватная	СУМА Агульная
	I. Капіталы.		
1.	Асноўны	624174—00	
2.	Зваротны	78285—21	
3.	Амартызацыйны	9192—28	
4.	Рэзэрвовы	1938—50	713589—99
	II. Фонды.		
1.	Фонд палепшаньня быту рабочых і служ.	1059—81	1059—81
	III. Рэзэрвы.		
1.	Рэзэрв няпэўных даўгоў	24274—60	
2.	Рэзэрв на зьніжэньне цэн	4814—72	29089—32
	IV. Доўгатэрміновыя крэдыты.		
1.	Пазыкі з Белкамунбанку	70088—08	
2.	З сельска-гаспадарчага банку	9080—00	
3.	Ад АВК	6773—84	
4.	З прамфонду	54000—00	139941—92
	V. Банкі па вучоту вэксалёў	187527—38	187527—38
	VI. Вэксалі выдадзеныя	71010—10	71010—10
	VII. Падсправаздачныя сумы	3054—73	3054—73
	VIII Крэдыторы		
1.	Рабочыя і служачыя	1457—26	
2.	Дастаўшчыкі	119819—27	
3.	Пакупнікі	58656—04	
4.	Розныя крэдыторы	53876—88	233809—65
	IX. Пераходныя сумы	2558—71	2558—71
	X. Прыбытак за справаздачны год	16392—54	16392—54
	БАЛЯНС	—	1398033—95

Дырэктар трэсту А. ЦІХАНАЎ. Галоўны бухгальтар М. ШАТЭРНІК.

Рахунак прыбытку і страт.

ДЭБЭТ

№№	НАЗВА АРТЫКУЛАЎ	СУМА
1.	Страты ад рэалізацыі тавараў і паўфабрыкатаў	2114—62
2.	Гандлёвыя выдаткі	37831—43
3.	Агульна-адміністрацыйныя выдаткі	31732—26
4.	Процанты ўплачаныя:	
	а) па кароткa-тэрміновых крэдытах	18755—67
	б) па доўга-тэрміновых крэдытах	574—39
5.	Страты ад недахопу зношанай маемасьці	2330—41
6.	Страты ад эксплёатацыі прадпрыемств. Трэсту.	14690—68
7.	Аддлічэньні ў рэзэрв няпэўных дэбіторaў.	12625—31
8.	Штрафы, пені і няўстойкі.	465—72
9.	Убытак па лесазводах ад расьпілоўкі чужога лесу.	3199—86
10.	Утрыманьне кансэрвіраваных прадпрыемстваў	2785—00
11.	Страты мінулых гадоў	19236—29
12.	Іншыя выпадковыя страты	295—65
		142657—28
	Чысты прыбытак.	16392—54
	БАЛЯНС.	159049—82

КРЭДЫТ

№№	НАЗВА АРТЫКУЛАЎ	СУМА
1.	Прыбытак ад рэалізацыі тавараў і паўфабрыкатаў	108425—06
2.	Прыбытак ад выкананых работ на старану (за перавозку сьпірту)	2433—65
3.	Процанты атрыманыя: а) па бягучых рахунках	591—47
	б) па разьліках і вэксалёх	11066—96
4.	Прыбытак ад рэалізацыі маемасьці	3397—16
5.	Прыбытак ад пералічэньняў астачы рэзэрву няпэўных дэбіторaў	535—44
6.	Прыбытак ад эксплёатацыі прадпрыемстваў Трэсту	15080—17
7.	Прыбытак па лесазводах ад расьпілоўкі чужога лесу	1472—57
8.	Выпадковыя прыбыткі: ад атрыманых скідак пры разьліках за пастаўленую сыравіну і матар'ялы	16049—34
	БАЛЯНС.	159049—82

РАЗЬМЕРКАВАНЬНЕ ПРЫБЫТКАЎ.

Прыбытковы падатак	1639—25	
Аддлічэньне на профнавучаньне	442—59	2081—84
У фонд палепшаньня быту рабочых	1431—07	
У рэзэрвовы капітал	1431—07	
У акруговы Прамфонд	3577—67	
У рэспубліканскі прамфонд	1431—07	
У мясцовы бюджэт	4293—21	
У зваротныя сродкі	2146—61	14310—70
РАЗАМ.		16392—54

Дырэктар трэсту А. ЦІХАНАЎ. Галоўны бухгальтар М. ШАТЭРНІК

Гэты баланс, рахунак прыбыткаў і страт і разьмеркаваньне прыбыткаў зацьверджаны прэзыдыумам Аршанскага АВК 23 мая 1929 году і да друку дазваляюцца.

Інспэктар Акрфа КАГАН.